❑ *Рэспубліцы пагражае паводка. Ці ўсе гатовы сустрэць яе?*
1-я — 3-я стар.

❑ *Калейдаскоп веснавых цэнаў: даражэюць «вітаміны».*
1-я стар.

❑ *Беларуская вёска: зямля шукае гаспадара.*
2-я стар.

❑ *Каханне і бальніца. Дзве інтымныя гісторыі.*
4-я стар.

ЗВЯЗДА

20 сакавіка 1996 г. серада, № 75 (22878)

● выдаецца са жніўня 1917 г. ● БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА ● цана 1000 рублёў

РОЗГАЛАС

ПАЛЯПШЭННЕ ЁСЦЬ, АЛЕ ЧЫМ ГАНДЛЮЮЦЬ?

Як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ў Міністэрстве гандлю, аб'ём рознічнага тавараабароту за студзень-люты 1996 года склаў 7487,7 млрд. рублёў і павялічыўся ў параўнанні з адпаведным перыядам мінулага года ў 81,9 раза, у параўнальных цэнах знізіўся на 9 працэнтаў.

Як адзначаюць спецыялісты, пры гэтым тэмпы падзення тавараабароту ў лютым склалі толькі 0,8 працэнта. У той жа час працягвае пагаршацца структура тавараабароту. Так, удзельная вага харчовых тавараў у аб'ёме рознічнага тавараабароту за студзень-люты бягучага года склала 69,2 працэнта супраць 62,4 працэнта за адпаведны перыяд мінулага года.

Сяргей РАСОЛЬКА.

ПРАФЕСІЯНАЛЫ ПАТРЭБНЫ ЗАЎСЁДЫ

Па стану на 1 студзеня 1996 года агульны некамплект афіцэраў у беларускіх Узброеных Сілах складаў крыху больш за дзве тысячы чалавек. У тым ліку на першапачатковых пасадах не хапала 1.145 афіцэраў, з іх камандзіраў узводаў — 617.

Найбольшы некамплект зведвалі ракетныя войскі і артылерыя (263 чалавекі), войскі сувязі (281), войскі ППА (266), інжынерныя (99), медыкі (146).

Аляксандр МАКАРАЎ.

НА АДНУ ВАКАНСІЮ — ЧАТЫРНАЦЦАЦЬ БЕСПРАЦОЎНЫХ. ПАКУЛЬ?

Паводле даных Магілёўскага цэнтра занятасці насельніцтва, з пачатку года колькасць афіцыйна зарэгістраваных беспрацоўных у горадзе павялічылася на 32 працэнты і склала 7316 чалавек.

Безумоўна, павелічэнне колькасці «лішніх людзей» літаральна ў арыфметычнай прагрэсіі не радуе. Але ўдвая засмучае іншае: калі на пачатку 1995 года на адно вакантнае месца ў Магілёве прэтэндавалі чытыры беспрацоўныя, дык сёння апошняя лічба ўзрасла да чатырнаццаці. Чакаецца, што становішча на гарадскім рынку працы будзе пагаршацца і далей.

Сяргей ГРЫБ.

У МІНСКУ «ЛАДЫ» ПА-РАНЕЙШАМУ Ў ЦАНЕ

Пераход Рэспублікі Беларусь да рынку, які суправаджаецца нястрымным ростам цэн і абгрунтаванымі інфляцыйнымі чаканнямі, уносіць свае карэктывы і ў кошт аўтамабіляў. Паколькі для большасці грамадзян іншамаркі па-ранейшаму застаюцца звышдарагімі і недасягальнымі, яны часцей за ўсё робяць стаўку на «Жыгулі» і «Самары».

Аднак той сумы грошай, якой дастаткова было для пакупкі новенькай легкавушкі яшча год назад, сёння ўжо не хапае. Напрыклад, у пачатку мінулай вясны сталічная фірма «ВАЗсервіс» рэалізоўвала «ВАЗ-2108» па 5200—5400 долараў ЗША. Цяпер для таго, каб стаць уладальнікам «васьмёркі», трэба выкласці ўжо 6500—6700 тых жа амерыканскіх долараў.

Мяняецца малюнак не толькі па цэнах, але і па асартыменту наяўных на рынку машын. І гэта цесна ўвязана з вытворчымі планамі Волжскага аўтазавода і яго экспартнай палітыкай (большасць прадаваемых у нас тальяцінскіх малалітражак — рээкспартныя). Так, сёння вельмі цяжка знайсці «ВАЗ-21051», 21063, 21072, 21081, аснашчаныя рухавіком рабочым аб'ёмам 1300 куб. см. Попыт на іх не толькі ў Беларусі, але і ў СНД невялікі, і таму імпарцёры стараюцца не закупляць такія мадэлі, робячы ўпор на больш магутныя — 1,5—1,6-літровыя карбюратарныя версіі, а таксама 1,7-літровыя інжэктарныя (з упырскваннем паліва).

Паляўнічыя, рыбаловы, дачнікі, напэўна, будуць «паляваць» за поўнапрывадными версіямі ўсюдыходаў «Ніва-Тайга». Але перш чым дасягнуць запаветнай мэты, ім трэба будзе раскашэліцца на 8000—8400 долараў ЗША за «ВАЗ-21213» або на 8200—8300 долараў ЗША — за «ВАЗ-21214».

Такім чынам, вы ў курсе самых свежых цэн. Званіце на фірмы, наведвайце аўтасалоны, і — удалай пакупкі!

Аляксандр ТРАХАЧОЎ.

Арганізацыя прадае:

аўтамабілі МАЗ

рухавікі ММЗ

Д-243-91
Д-243-94
Д-245-20

Тэлефон (0172) 308-785

ВЯСНА... КАЛЕЙДАСКОП ЦЭН ЗНОЎ КРУЦІЦЦА

Мінулы тыдзень па «традыцыі» не абышоўся без чарговай змены цэннікаў на шэрагу харчовых тавараў у многіх рэгіёнах краіны. Найбольш істотнае павелічэнне мінімальных рознічных цэн адбылося ў групе плодаагароднінай прадукцыі, напэўна, у сувязі з заканчэннем зімы і дэфіцытам вітамінаў.

Так, рознічныя цэны павялічыліся ў Магілёве: на бульбу — на 7,7 працэнта, на цыбулю — на 20 працэнтаў; у Брэсце: на моркву — на 25 працэнтаў, капусту — 14,3, буракі — 17,9 працэнта; у Гомелі: на цыбулю — на 12,7 працэнта, на капусту — на 50 працэнтаў. Камітэт цэн Мінэканомікі сумесна з абласнымі аддзеламі цэн правёў аператыўныя праверкі абгрунтаванасці такога росту цэн, у выніку чаго высветлілася, што разам з аб'ектыўнымі прычынамі мелі месца і манапольныя павелічэнні прадпрыемствамі ўзроўню цэн.

З асноўных харчовых тавараў за мінулы тыдзень узровень мінімальных рознічных цэн узрос таксама на сыр цвёрды ў Магілёўскай вобласці (3,8 працэнта) за кошт паступовага павелічэння ў гандлёвай сетцы сыроў, выпрацаваных пасля студзеньскага павелічэння закупачных цэн на малако, а таксама на мяса птушкі ў Віцебску і Магілёве (4,4—4,9 працэнта) у сувязі з пераходам прадпрыемстваў сістэмы птушкапрома да адпускных цэн, якія дзейнічалі са жніўня 1995 года (у зімовы перыяд з-за значных паставак замежных курыных кумпячкоў і зніжэння попыту на айчынную птушку адпускныя і рознічныя цэны на яго зніжаліся, а вытворчасць мяса птушкі была стратнай).

Сяргей РАСОЛЬКА.

АЛІМПІЙСКІЯ КЛОПАТЫ БЕЛАРУСКАГА ЎРАДА

Ход падрыхтоўкі зборнай каманды Беларусі да XXVI летніх Алімпійскіх гульняў у Атланце разгледжаны на рабочай нарадзе пад старшынствам віцэ-прэм'ера Уладзіміра Русакевіча. У ёй прынялі ўдзел кіраўнікі Міністэрства фінансаў, Міністэрства спорту і турызму і Нацыянальнага алімпійскага камітэта.

На нарадзе, у прыватнасці, адзначалася, што практычна выкананы ўсе перадалімпійскія мерапрыемствы. Абмяркоўваліся таксама пытанні далейшага фінансавання вучэбна-трэніровачных збораў, набыцця білетаў на авіярэйсы ў Амерыку, куды будзе дастаўлена 210-220 атлетаў, трэнераў, урачоў і афіцыйных асоб.

Падводзячы вынікі нарады, Уладзімір Русакевіч асабліва падкрэсліў той факт, што ўпершыню ў гісторыі нашай дзяржавы на летніх Алімпійскіх гульнях Беларусь будзе прадстаўлена самастойнай камандай. Ён пацвердзіў гатоўнасць урада рэспублікі адшукаць усе неабходныя сродкі для падрыхтоўкі нашых спартсменаў да Гульняў-96 і іх паспяховага выступлення ў Атланце.

Вячаслаў ДУТАЎ, БЕЛТА.

ЦІ СОЛАДКА БЫЦЬ АКЦЫЯНЕРАМ?

Ледзь хопіць на два разавыя трамвайныя білеты дэвідэндаў за 1995 год ад кожнага дзесятка акцый Віцебскага адкрытага акцыянернага таварыства «КІМ» яго акцыянерам. Гэтая цікавая, а для некага даволі сумная рэч высветлілася на нядаўна прайшоўшым гадавым сходзе.

Замест 52 млрд. рублёў прыбытку прадпрыемства атрымала ў 5 разоў менш. Аб'ём вытворчасці за год тут скараціўся амаль удвая, а ў параўнанні з 1990 годам — у 5 разоў. Прэзідэнт таварыства Уладзімір Базека па ўласнаму жаданню кінуў руль кіравання калектывам. Аднак калі акцыянеры з «КІМа» сабраліся ў сваім культурна-дзелавым цэнтры, каб зацвердзіць новага кіраўніка і мяркуемыя дэвідэнды на наступны год, яны ўпэўніліся, што залежыць ад іх зусім мала. Ільвіная доля акцый прадпрыемства ўсё яшчэ застаецца ў руках дзяржапарэту нявыкупленай. Ён і правёў праз безальтэрнатыўнае галасаванне на пасаду прэзідэнта не «кімаўца», а былога начальніка ўпраўлення бытавога абслугоўвання аблвыканкома Юрыя Галыкіна. Дарэчы, апошні адразу папярэдзіў: калі калектыў не зможа выкупіць больш акцый, то інвестфонды зусім «раздзенуць» яго.

Аляксандр ТУЛБУСАЎ.

БЕЛАРУСКІ «ЗАЙЧЫК»: РАСІЙСКІ РУБЕЛЬ — 2,29 НА КАРЫСЦЬ АПОШНЯГА

Паводле даных Міністэрства статыстыкі і аналізу Рэспублікі Беларусь, у выніку разліку парытэту пакупной здольнасці беларускага рубля ў адносінах да расійскага па адзінай з Дзяржкамстатам Расіі метадалогіі такі паказчык за студзень 1996 года склаў 2,29 беларускага рубля за адзін расійскі рубель.

Як растлумачылі карэспандэнту «Звязды» ў Мінстаце, парытэт пакупной здольнасці складваецца ў выніку параўнання цэнавых характарыстык 314 відаў тавараў і паслуг двух бакоў. У гэту групу ў асноўным уваходзяць прадуктовыя і прамысловыя тавары айчыннай вытворчасці. Выключэнне складаюць імпартныя тавары, якія паступаюць у Беларусь з-за рубежа і не маюць адпаведных аналагаў у нашай рэспубліцы. Трэба таксама адзначыць, што ў камерцыйных банках курс расійскага рубля практычна не апускаўся ніжэй адзнакі 2,4. У Нацыянальным банку Беларусі той жа рэйтынг ужо доўгі час застаецца на ўзроўні 2,37 беларускага рубля за 1 расійскі рубель.

Разлік парытэту пакупной здольнасці, паводле сцвярджэння аднаго са спецыялістаў дэпартамента валютнага рэгулявання Нацбанка служыць адным з якасных метадаў ацэнкі адносінаў курсаў розных краін. Аднак ён напрамую не ўплывае на рэальную цану куплі-продажу зыходных валют на біржы. Цяпер у галоўным банку краіны вядуцца разлікі па вызначэнню парытэту пакупной здольнасці ў адносінах да валют Украіны і Казахстана — карбованца і тэнге. Што ж датычыць вызначэння такога парытэту ў адносінах да амерыканскага долара, то, на думку работніка Нацбанка, праводзіць такія разлікі не ўяўляецца магчымым. У першую чаргу гэта звязана з істотнай розніцай у класе вырабляемых тавараў, а па другое — з велізарным адрозненнем у якасці прадастаўляемых паслуг.

Сяргей КУРКАЧ.

ПАКУТЛІВЫ БОЛЬ ЧАРНОБЫЛЯ АДКЛІКАЕЦЦА Ў СЭРЦАХ НАРОДАЎ-СУСЕДЗЯЎ

Сярод мноства розных форумаў, якія ва ўсім свеце праводзяцца напярэдадні дзесяцігоддзя чарнобыльскай трагедыі, адной з самых значных стала першая Міжнародная канферэнцыя Еўрапейскай камісіі, Беларусі, Расійскай Федэрацыі і Украіны па радыялагічных выніках чарнобыльскай аварыі. Яна адкрылася 18 сакавіка ў беларускай сталіцы.

У рабоце канферэнцыі прымаюць удзел каля шаснаццаці вучоных і дзяржаўных дзеячаў з 32 дзяржаў свету, а таксама прадстаўнікі буйнейшых міжнародных арганізацый — ААН, ЮНЕСКО, Еўрапарламента, Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, МАГАТЭ, Міжнароднай Федэрацыі таварыстваў Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца. З прывітальным словам да іх звярнуўся Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Ад імя беларускага народа, парламента і ўрада рэспублікі кіраўнік нашай дзяржавы падзякаваў удзельнікам канферэнцыі за ўвагу да чарнобыльскіх праблем. «Пакутлівы цяжар вынікаў чарнобыльскай катастрофы яшчэ доўга будзе адклікацца ў сэрцах беларускага, украінскага і расійскага народаў, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — Я ўпэўнены, што і вы падзяляеце наш боль».

У сваім выступленні Прэзідэнт Беларусі прывёў шэраг лічбаў, якія ён папрасіў успрыняць не толькі «халодным розумам», але і сэрцам. У выніку аварыі 23 працэнты тэрыторыі рэспублікі падвергліся радыеактыўнаму забруджванню, з гаспадарчага выкарыстання выведзена 6000 квадратных кіламетраў зямель. З найбольш заражаных тэрыторый адселена 131 тысяча чалавек. Каля двух мільёнаў чалавек, у тым ліку 484 тысячы дзяцей, пражываюць на забруджаных беларускіх землях.

Прэзідэнт удакладніў, што праведзеныя ў мінулым годзе даследаванні паказалі, што 23 працэнты тэрыторыі рэспублікі забруджаны цэзіем, 10 працэнтаў — стронцыем і каля двух працэнтаў — ізатопамі плутонію. Прэзідэнт падкрэсліў, што нягледзячы на тое, што пасля чарнобыльскай катастрофы мінула амаль 10 гадоў, найбольш пацярпеўшыя рэгіёны Беларусі працягваюць жыць у рэжыме надзвычайнага становішча.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, у бліжэйшы час кіраўніцтва рэспублікі мае намер удзяляць больш увагі пытанням вяртання забруджаных зямель у гаспадарчае карыстанне. Ён звярнуўся да ўсіх вучоных з просьбай расшырыць пошукі найбольш аптымальных метадаў рэабілітацыі пражаных радыяцыяй раёнаў.

У заключэнне Прэзідэнт Беларусі выказаў падзяку ўсім дзяржавам, якія працягнулі руку дапамогі рэспубліцы. Ён пажадаў удзельнікам канферэнцыі паспяховай і плённай працы.

Затым з дакладамі аб праблемах постчарнобыльскага перыяду выступілі кіраўнікі дэлегацый трох дзяржаў, якія пацярпелі ад радыяцыі, — беларускі міністр па надзвычайных сітуацыях і абароне насельніцтва ад вынікаў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС Іван Кенік, віцэ-прэм'ер-міністр Украіны Васіль Дурдзінец і міністр па надзвычайных сітуацыях Расійскай Федэрацыі Сяргей Шойгу.

На цырымоніі адкрыцця канферэнцыі прысутнічалі таксама Старшыня Вярхоўнага Савета Беларусі Сямён Шарэцкі, кіраўнік урада рэспублікі Міхаіл Чыгір, члены Кабінета Міністраў і беларускія парламентарыі. У першы дзень работы ўдзельнікі мінскага форуму прыступілі да абмеркавання рэзультатаў больш чым трохгадовых навуковых даследаванняў, якія сталі вынікам падпісанага ў 1992 годзе ў Брусэлі паміж ЕС, Расіяй, Беларуссю і Украінай пагаднення аб навуковым супрацоўніцтве ў вывучэнні вынікаў чарнобыльскай катастрофы.

Канферэнцыя завершыць сваю работу 22 сакавіка.

Эдуард ПІВАВАР, БЕЛТА.

ВІЗІТ У РАСІЙСКУЮ ДЗЯРЖДУМУ ДАПАМОГ ВЫСВЕТЛІЦЬ ПОГЛЯДЫ ФРАКЦЫЙ НА БУДУЧЫНЮ АДНОСІНАЎ РАСІІ І БЕЛАРУСІ

Беларускія і расійскія дэпутаты дагаварыліся аб стварэнні сумеснай міжпарламенцкай групы па падрыхтоўцы заканадаўчых актаў у галіне эканомікі. Такі галоўны вынік візіту беларускіх парламентарыяў у Дзяржаўную думу Расійскай Федэрацыі. Аб гэтым паведаміў 18 сакавіка на прэс-канферэнцыі ў Вярхоўным Савеце кіраўнік дэлегацыі намеснік спікера Генадзь Карпенка.

Паводле слоў Генадзя Карпенкі, бакі пакуль што не зрабілі значных крокаў наперад з пункту гледжання эканамічнай інтэграцыі. Ён адзначыў, што гэты пункт гледжання выказалі і многія расійскія палітыкі, у тым ліку Аляксандр Шохін, Рыгор Яўлінскі і іншыя. Як, напрыклад, падкрэсліў у гутарцы з беларускімі калегамі дэпутат Дзярждумы Бабурын, адсутнасць такіх крокаў на ўзроўні дзяржаў у сучасны момант падмяняецца цеснымі кантактамі на ўзроўні прыватнага капіталу, у тым ліку нафтаперапрацоўчага комплексу.

Сустрэчы ў Маскве паказалі, адзначыў Генадзь Карпенка, што парламенцкія фракцыі па-рознаму бачаць будучыню беларуска-расійскіх узаемаадносінаў. Калі, напрыклад, «Наш дом — Расія» і «Яблык» выступаюць за цесныя эканамічныя кантакты, зыходзячы з дзяржаўнасці дзвюх краін, то ў камуністаў больш далёкасяжныя планы: ад эканамічнай інтэграцыі — да палітычнага і ваеннага саюза. Генадзь Карпенка паведаміў, што на наступным тыдні чакаецца прыезд у Беларусь Старшыні Савета Федэрацыі Расіі Ягора Строева.

Ларыса ЛАЗАР, БЕЛТА.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 103

Аб вызваленні М. А. ГАЛКО ад пасады галоўнага рэдактара «Народнай газеты»

1. Вызваліць **Галко** Мікалая Андрэевіча ад пасады галоўнага рэдактара «Народнай газеты» ў сувязі з неадпаведнасцю выконваемай рабоце (п. 2 арт. 33 Кодэкса законаў аб працы Рэспублікі Беларусь).

2. Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 20 красавіка 1995 г. № 157 «Аб назначэнні М. А. Галко галоўным рэдактарам «Народнай газеты» прызнаць страцўшым сілу.

3. Гэты Указ уступае ў сілу з моманту апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

18 сакавіка 1996 г., г. Мінск.

УКАЗ ПРЭЗІДЭНТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

№ 104

Аб назначэнні М. В. ШЫМАНСКАГА выконваючым абавязкі галоўнага рэдактара «Народнай газеты»

1. Назначыць **Шыманскага** Міхаіла Віктаравіча выконваючым абавязкі галоўнага рэдактара «Народнай газеты».

2. Унесці на разгляд першай сесіі Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь трынаццатага склікання пытанне аб назначэнні Шыманскага Міхаіла Віктаравіча галоўным рэдактарам «Народнай газеты».

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.

18 сакавіка 1996 г., г. Мінск.

ПРЭСА

У ДОМЕ ДРУКУ ЧАРГОВЫЯ КАДРАВЫЯ ПЕРАСТАНОЎКІ

Заўчора позна ўвечары мы атрымалі чарговую навіну з журналісцкага фронту — пра змену галоўнага рэдактара «Народнай газеты». Адбылося тое, пра што даўно гаварылі і чаго з насцярожанасцю чакалі як у калектыве рэдакцыі, так і ў журналісцкім асяроддзі ўвогуле.

Як вядома, не так даўно Мікалаю Галко прапанавалі пайсці па ўласным жаданні, але ён наадрэз адмовіўся пакінуць пасаду. Адным словам, усе разумелі, што рэдактара знімуць, але не ведалі калі. Тым больш, што і адхіліць Галко ад пасады было куды прасцей, чым некалі І. Сярэдзіча: ён быў прызначаны ўказам Прэзідэнта, аналагічным указам і вызвалены. Юрыдычна ўсё, здаецца, чыста, заставецца толькі маральны бок.

Нечаканай для многіх была кандыдатура, якую Аляксандр Лукашэнка прапанаваў на месца Галко, — сённяшні галоўны рэдактар «Белорусской нивы» Міхаіл Шыманскі. Учора прадстаўнічая дэлегацыя з калідораў выканаўчай і заканадаўчай улады наведала калідоры дома 10а па вуліцы Б. Хмяльніцкага. Супрацоўнікам «Народнай газеты» быў прадстаўлены новы шэф, дакладней, выконваючы абавязкі галоўнага рэдактара, бо на гэты раз мяркуецца, што кандыдатура будзе зацверджана Вярхоўным Саветам — адзіным заснавальнікам газеты, а таксама быў зачытаны ўказ аб звальненні М. Галко па прычыне... «неадпаведнасці выконваемай рабоце». Потым адбылася нарада ў «Белорусской ниве», у выніку якой стала вядома, што М. Шыманскі застаецца галоўным рэдактарам пакуль і там. Дарэчы, сітуацыя, калі адзін чалавек сядзеў на двух самых высокіх крэслах, не новая для Дома друку. У свой час сам Галко кіраваў і «СБ», і «НГ».

Што адбудзецца з творчым калектывам пасля ўсіх кадравых перастановак, сказаць адназначна цяжка. Ва ўсякім разе, учора быў прыняты зварот супрацоўнікаў выдання да Вярхоўнага Савета з просьбай вырашыць як мага хутчэй пытанні юрыдычнай абароненасці кіраўніка

(Заканчэнне на 3-й стар.)

СУПРАЦЬ ПАВОДКІ — УСЁЙ ГРАМАДОЙ

У памяці жыхароў палескіх раёнаў Гомельшчыны яшчэ не сцёрліся трывогі і непрыемнасці веснавой паводкі 1994 года, калі многія населеныя пункты і гаспадаркі пацярпелі ад яе, як зноў трэба асцерагацца разгулу стыхіі. Бо, як сцвярджаюць спецыялісты Рэспубліканскага камітэта па гідраметэаралогіі, у час паводкі магчыма падтапленне дваццаці двух населеных пунктаў у Жыткавіцкім, такой жа колькасці іх — у Петрыкаўскім, семнаццаці — у Мазырскім, чатырнаццаці — у Калінкавіцкім, дзесяці — у Хойніцкім, дзевяці — у Нараўлянскім, шасці — у Лельчыцкім і двух — у Акцябрскім раёнах. Вядома ж, у гэтых, а таксама ў Ельскім раёне пад вадой можа апынуцца і вялікая частка сельскагаспадарчых угоддзяў.

Такі прагноз небеспадстаўны, бо вышыня снежнага покрыва ў басейне Прыпяці ў сярэднім складае да паўметра пры запасе вады ў снезе ад сарака да ста міліметраў, што на пяцьдзесят працэнтаў вышэй нормы. На правабярэжных прытоках Прыпяці (а гэта ўжо Украіна) запасы снегу таксама вышэй шматгадовых значэнняў і пры дружным таянні яго максімальныя ўзроўні вады могуць аказацца на трыццаць—семдзесят сантыметраў вышэй звычайных велічынь.

А ўзяць лядовую абстаноўку. Спецыялісты лічаць яе даволі складанай, асабліва ніжэй Мазыра і на Кіеўскім вадасховішчы, дзе таўшчыня лёду складае ад сарака да шасцідзесяці пяці сантыметраў. У гэтай сітуацыі існуе вялікая верагоднасць

(Заканчэнне на 3-й стар.)

ФОТАСЛОВА

Яўген ПЯСЕЦКІ

Дуда ў кішэні,
хлеб у жмені.
Бывай, паночкі,
хадзем, браты!
Спяю пра волю
ды нашу долю,
каб было чутна
на свеце тым.
Дзяды пачуюць:
мы «не згінэлі»,
не сцёрла ліха,
не звёў прыгон.
Люляюць песню,
нібы арэлі,
дуда музыкі
і Божы звон.

На гэтых фотаздымках вядомы беларускі майстар народных інструментаў музыка Уладзімір ПУЗЫНЯ і малады званар Дзмітрый ЗУБОВІЧ.

Ніл ГІЛЕВІЧ,
народны паэт Беларусі

ЛЕПШ НЕ ДАЖЫЦЬ...

Лепш не дажыць —
Чым раптам я пачую,
Што мне пачуць —
Страшней за смерць самую.
Лепш у няведанні,
Даруй мне, Божа,
Астатак дзён
Прашкрэбаць на зямлі
І з верай адысці,
Што ўсё ж не зможа,
І ўсё ж не зможа
Чорны яд змяі,
Хоць ён і трапіў
З раны ў кроў жывую,
Дайсці да сэрца Маці
І спыніць
Біццё ягонае!..
Лепш не дажыць,
Чым тое знаць,
Што горш за смерць самую.
11.3.1996

ЗНОЙДЗЕШ!

Вось і зноўку ты звенчыў,
Братка-беларус,
Што жыццё табе знявечыў
Нелюдзяў хаўрус.

Енчыш ты і ўсё пытаеш:
«Па чыёй віне?»
І штодзень збыцця шукаеш
У п'янкім віне.

Не тужы, бядак-гаротнік!
Не прывык хіба?
Не да смаку ў падваротні
Жыць жыццём раба?

Ты ж яшчэ, як пры лучыне
Дзеткам лапці плёў,
Рады быў, што прылучылі
К стану халуёў.

Дык не плач, што не па-боску
Бог адмераў зла.
Кінуць, кінуць табе костку
З панскага стала.

Раз не маеш сам намеру
Стаць гаспадаром —
Знойдзеш, знойдзеш на вячэру
Костку пад сталом.
9.3.1996

КЕПСКА КОНЧЫШ, СУСЕДЗЕ!

Суседзе мой, ты што гэта —
Сур'ёзна ці жартуеш?
Ці ўкруг сябе нічога ты
Не бачыш і не чуеш?

Процістаянне ўсякае
Раўняецца крамоле,
А ты яшчэ ўсё вякаеш
На гэтай хамскай мове!

Зірнуў бы, недарэка ты,
Што робяць хлопцы-хваты:
Дырэктары, прарэктары,
Міністры, дэпутаты.

Яны і дня не думалі!
На хвалі паваротнай —
Як па камандзе плюнулі
У сэрца маці роднай.

Ураз пад грозным скіпетрам
Змаглі «прагрэс» засведчыць.
А ты? Ці гэтак выпетраў,
Што ўжо і плюхнуць нечым?

Парві з «абарыгенамі».
Забудзь, што родам з Грэска.
І — выраўняйся з гэнымі!
Інакш — будзе кепска!

Інакш лёс твой збэрсаны
Акажацца фатальным —
І ў годнасці прафесара
Ты кончыш падмятайлам.
8.3.1996

НОВААБРАНЫМ АКАДЭМІКАМ АНБ

Браты мае, Адаме і Ўладзімер,
Генадзь, і Мікалай, і Леанід, —
Вядомыя не толькі на Радзіме
Вучоныя з нераспластаных ніц!

Я вас віншую горача з абраннем
У Акадэмію Навук, сябры, —
З даўно заслужаным высокім званнем,
Асвенчаным на боскім алтары.

Рэкамендацыі далі вам не калегі, —
Дабраславеннем вам быў запавет
Скарыны, Цяпінскага і Сапегі,
Што роднай мове шлях праклалі ў свет.

Сход Аддзялення быў у поўным складзе.
Сам Ігнатоўскі ў зале вас сустрэў.
Яшчэ ён верыць партыі і ўладзе,
Яшчэ не грымнуў у пакоі стрэл.

Пры ім, яшчэ не вязень і не ссыльны,
Ластоўскі — «неадменны сакратар».
І Лёсік побач — правапісец слынны,
Яшчэ не звезены ў якісь Ахтарск.

Далей Купала — ён яшчэ ў гуморы,
Яшчэ да харакіраў цэлы год.
З Купалам поруч Колас: хоць і хворы,
Але прыехаў дзеля вас на сход.

І Некрашэвіч — поўны творчай моцы
Лексікалог і віцэ-прэзідэнт,
І сын народа рускага Замоцін,
У край наш мілы закаханы ўшчэнт;

І першы рэктар БДУ Пічэта,
У вяцкі край не высланы пакуль;
І Гартны — рыцар ленінскіх дэкрэтаў,
Яшчэ не звар'яцелы ад пакут;

І Нёманскі, якому курапацкі
Яшчэ і ў снах не зеўрыў цёмны дол;
І Тарашкевіч, што з вітаннем брацкім
У гонар вас прабраўся праз кардон...

Якія знаныя мужы навукі
Вас прынялі ў акадэмічны храм!
З якой павагай падалі вам рукі!
Якіх назычылі зычэнняў вам!

Вось бачыце, сябры!
А вы — не верылі!
А вы ўсё думалі, з тугой у сэрцы,
Што мы і сёння пад пятой імперыі,
Што ў нас пануюць беларусажэрцы.

Дык спору ў працы вам, сяўцы праўдзівых
І вольных дум! Я ўзрушаны да слёз:
З адвечных мук, крывёй перабрадзілых,
Дзень Беларускай Годнасці прарос!
31.1.1996

КАЛГАС, ЯК СЯМ'Я: ПРАГУЛЯЛІ ЦІ ЎКРАЛІ — БЯДУЮЦЬ

У калгасе «Перамога», што ў Глыбоцкім раёне, на справаздачна-выбарным сходзе прысутнічаў адзін вялікі гандлёвы начальнік з Віцебска. Калі старшыня гаспадаркі ў сваім выступленні зноў пачала аб парытэце цэн, аб тым, што сельская гаспадарка становіцца заложніцай якіх-небудзь рэформаў, ён абурыўся. Маўляў, пра якое павелічэнне цэн на тое ж малако вы можаце гаварыць, калі ўжо і сёння цэны на малако ў крамах вышэй за сусветныя. І тут у сваю чаргу абурылася Алёна Дзягель, якая семнаццаць гадоў кіруе гаспадаркай: «Няўжо не хапае жадання палічыць? Калгас здае малако ахаладжаным, тлустасцю ад 3,4 да 3,8 працэнта, дабіваецца толькі высокага гатунку. А атрымлівае за літр 1,3 тысячы рублёў. А рэалізуецца малако людзям тлустасцю 2,4 працэнта, ужо, выбачайце, за 3,9 тысячы рублёў. Дык дзе элементарная справядлівасць? Улічыце яшчэ, што толькі паілка для жывёлы каштуе 80 тысяч рублёў, а праслужыць можа хіба з год. У калгасе ж тысяча галоў».

Ох ужо гэта вечная тэма калгасаў. Вельмі многім яна надакучыла, вельмі для многіх з'явілася асновай нават папулярнасці і палітычнай кар'еры. А вось абстаноўка ў аграрным комплексе не мяняецца да лепшага. Неадварот, і непрыхільнікі, і яўныя апалагеты калгасаў сцвярджаюць, што сітуацыя даўно катастрафічная, што размова можа ісці аб блізкім краху.

Але сёння размова пойдзе якраз аб адваротнай з'яве. Мы пабываем у калгасе, які насуперак тэндэнцыям трымаецца на плаву. Такім чынам, калгас «Перамога» на Глыбоччыне. Пашпарт, калі можна так сказаць, у гаспадаркі звычайны для невялікіх калгасаў. 1700 гектараў пашы, пяцьсот кароў, 300—400 галоў на адкорме, астатняе — маладняк. Вось у аноўным і ўвесь патэнцыял. Ніякіх падсобных вытворчасцей тут не разгортвалі. «Чыста» сельскагаспадарчы калгас, прычым з невялікіх, не гігант.

Але чым адрозніваецца ён ад астатніх? Па-першае, тым, што не мае перад дзяржавай даўгоў. Ну не мае, і ўсё тут. Анамалія такая здарылася. Бралі неяк таварны крэдыт на гаруча-змазачныя матэрыялы, разлічыліся за яго ў кастрычніку, хаця астатнім запазычанасць прадоўжылі да мая. Цяпер гавораць, што тым, хто заплаціў, новы крэдыт на паліва дадуць у першую чаргу. Наўрад ці, бо сеяць трэба ўсім, а ў «Перамозе» грошы знойдуцца. Больш таго, часам нават раён пазычае нейкія сумы ў гаспадаркі, напрыклад, на закупку солі і паліва, запчастак.

Калгас ніколі не з'яўляўся ўзорна-паказальным, усё, што тут пабудавана, і, дарэчы, будуецца і сёння, — за свой кошт, за кошт працы людзей. Гадоў з пятнаццаць назад правялі меліярацыю на 400 гектарах. Гэта, праўда, за кошт дзяржавы. Вы вось бяда — меліярацыя польдэрная. І ў час «меднага» буму расцягнулі многае з помпавых, давялося шукаць і шукаць, бо абставяванне было імпартным. Таму ў мінулым годзе з сяўбой спазніліся, а тут яшчэ на меліяраваных землі ды сухое лета. Так што ўраджаем гаспадарка не можа пахваліцца.

Дык адкуль феномен?

А феномен, як гэта ні дзіўна, у самой старшыні. Мы спецыяльна наведалі хату Алёны Іосіфаўны. Так, менавіта хату, на вясковых мерках неблагую, але, зразумела ж, аднапавярховую, і жыве ў ёй старшыня ўжо семнаццаць гадоў, і ніякага сабе асабняка ні ў Глыбокім, ні далей не пабудавала. І дачка, якая ў Мінску, кааператыва сабе не пабудавала.

Алёна Іосіфаўна зазначае: «Калі старшыня пабудаваў сабе ў раёнцэнтры трохпавярховы асабняк, а то і больш, а то і дзе яшчэ далей — гэта што, не адаб'ецца адмоўна на рэнтабельнасці гаспадаркі? А ў нас жа працыей пералічыць тых, хто не будаваўся. Я не гавару ўжо пра «мерседэсы».

Адметным на справаздачна-выбарным сходзе ў «Перамозе», пра які гаварылася вышэй, было тое, што старшыня будавала свой даклад на крытыцы недахопаў, называла канкрэтныя імёны, нават папярэджвала, што пры наступным парушэнні працоўнай дысцыпліны чалавек будзе вымушаны развітацца з калгасам. Яна не баялася крытыкаваць людзей перад сваімі выбарамі, яна адчувала сваю маральную перавагу, а гэта сёння вельмі і вельмі рэдкая з'ява.

Увогуле, бядотны стан нашых калгасаў у многім сёння з-за таго, што... крадуць. Да гэтага нас прывучалі дзесяцігоддзямі. Прыязджае які-небудзь сакратар з «раёна» ў гаспадарку і ўшчувае старшыню: «Ну нясе дзярма з фермы пару бракоў, які-небудзь кілаграм камбікорму — не заўваж. Час такі, усе крадуць». Вось гэта настроенасць на ўсеагульны крадзеж адгукаецца сёння. Бывала, што і Алёне Іосіфаўне даводзілася пасля скаргі якой даяркі ў «раён» вяртаць яе на працу — в як жа: працоўны чалавек паскардзіўся. А што гэты «працоўны» чалавек п'е з ранку да вечара і пастаянна цікуе, што б украсці, — не мела значэння. Калі ў «Перамозе» ўзяліся за дысцыпліну, было ўсякага. Былі нават шчырыя абурэнні: «Я ж усё жыццё несла з фермы. Навошта караеце?»

Дысцыпліна — гэта адзін з падмуркаў, на якім трымаецца дабрабыт, адносны, вядома, у «Перамозе». Тут пасля трох папярэджанняў парушальнік працоўнай дысцыпліны звальняецца з абавязковым запісам у працоўнай кніжцы аб прычыне звальнення. У рэшце рэшт, ён і папярэджваўся аб гэтым, калі ўладкоўваўся ў калгас. Трэба сказаць, што ў аноўным доўга не затрымліваюцца тут наезджыя, так званае «перакаці-поле». А вось да сваіх не такіх і шматлікіх парушальнікаў асаблівыя адносіны. Гэта ж і іх зямля. Таму калгас дапамагае дзецям вылівакаў, аплачвае школьныя снеданні, купляе нават абутак і г. д. Але грошай на рукі не выдае — усё роўна знікнуць.

Яшчэ адна слушная заўвага ў гэтым плане ў Дзягель была аб тым, што законы ў нас мала што не выконваюцца, але і пішуцца «пад пастуха». Толькі яго можна пакараць за тыя ж буракі. Але ў мінулыя дзесяцігоддзі і кіраўнікі прывыклі блытаць сваё з калгасным. Ды толькі пакараць іх практычна немагчыма. Такую «вольнасць» кіраўніка бачаць спецыялісты, брыгадзіры, загадчыкі фермаў, яны таксама пачынаюць выкарыстоўваць сітуацыю. І пайшла гаспадарка па ветры.

Ну добра, а што ў «Перамозе» з тым самым «ветрам»? Ды рэнтабельнасць у гаспадарцы 42 працэнты, у той час як па раёне — 14. Прычым на заработную плату выкарыстаны 31 працэнт, а па раёне — 53. Можна было б прыводзіць лічбы і далей. Аб тым, што тут адзін з самых высокіх у вобласці надой малака на 100 гектараў угоддзяў, што падзеж цялят ніякі — толькі сюды накіроўваюць праверкі, бо ёсць жа гаспадаркі, у якіх менш як сорак кароў са ста атрымліваюць прыплод. Што толькі ў «Перамозе» камбайнам убіраюць кармавыя буракі і маюць на гэтым найменшыя страты пры вырошчванні адной з самых працаёмкіх культур. Што не наладжваюць тут сувязі з камерсантамі, якія цэны даюць малыя, адно толькі «гешэфт» старшыні прапануюць. Што нават камяні з палёў тут збіраюць да дарог, а потым прадаюць асфальтным заводам. Што адкормачны статак тут рэалізуецца не ніжэй чым 400—500 кілаграмаў жывой вагі, што ніводная бульбіна не прападае, што старшыня не баіцца выставіць малочна-кансерваваму камбінату рахунак за неаплачанае малако...

Можна зразумець, невялікая гаспадарка, тут ёсць магчымасць наладзіць дысцыпліну, усё пракантраляваць, падлічыць, кожнаму дапамагчы. Вось такія гаспадаркі, напэўна, найбольш і рэальныя, бо колішняя наша пагоня за «гігантамі», на дзесятак і больш тысяч гектараў неапраўданая: усё роўна гэтыя гаспадаркі непрыметна распадаюцца на некалькі. А ў вялікім калгасе людзі не ведаюць нават, дзе сёння старшыня.

Што падабалася ў Алёне Іосіфаўне — гэта вялікая павага да людзей, з якімі працуе. Так, п'яніца вытрымаць без шкадавання, але ж гэта выключэнне. У аноўным людзі мясцовыя, тутэйшую зямлю лічаць адзінай карміцелькай, таму і вераць толькі працы на ёй.

Вось Канстанцін Васільевіч Арэхаў. Для яго няма слова-адмаўлення. Ён працуе ў полі столькі, колькі трэба. І не таму, што апанаваны яшчэ тымі ідэямі аб сацыялістычным будаўніцтве. Ён найперш гаспадар. І калі заставецца ў полі няўбраная канюшына — убярэ яе, хаця ў давялося не вылазіць з трактара да вечара. Так, і яму патрэбна, каб кіраўнік прыехаў у поле са словамі падзякі. Але ёсць у ім веданне таго, што праца будзе аплачана. За мінулы год зарабіў Канстанцін Васільевіч 13 мільёнаў, гэта з улікам таго, што месяц быў у доме адпачынку. Нехта са сталічных «бізнесменаў» усміхнецца: за пякельную працу — і столькі. Ну, па-першае, на вёсцы мільён — вялікія грошы, па-другое, мае ён і іншыя матэрыяльныя падзякі. Па-трэцяе, той хто працаваў з «халадком», атрымаў у калгасе толькі каля двух мільёнаў за год. Спрацоўвае каэфіцыент, які становіцца ацэнкай укладу кожнага калгасніка ў канкрэтную справу. Дарэчы, старшыня атрымала столькі ж за год, колькі і перадавы механізатар.

З цяжкасцю ўводзілася аплата працы па канчатковаму выхаду прадукцыі ў жывёлагадоўлі. Між іншым, жонка перадавога механізатара, Таіса Аркадзьеўна, цялятніца на дарошчванні, у якой прыбраці ў суткі ніколі не былі меншыя за 500 грамаў, у той час як у астатніх толькі па 300 грамаў, на адным са сходаў прама сказала: «Ды не чакайце вы, пакуль не будзем плаціць за выхад, што прыбраці ўзрастуць. Ім жа хочацца і «Трапіканку» паглядзець, і іншымі справамі заняцца, а ля цялятак трэба хадзіць, як ля дзяцей». І ўвялі такую аплату. Спачатку нават спецыялісты (іх, дарэчы, значна менш, чым у суседзяў) былі нездаволеныя, іх яна таксама закранала. Але калі ў студзені не атрымалі ўсіх даплат, зразумелі, што гэта сур'ёзна і назаўжды. Люты паказаў значны прырост выхаду прадукцыі. А як жа інакш: атрымаў планавы надой пры планавых кармах — мільён, а не атрымаў — каля пяцісот тысяч.

Трэба яшчэ падкрэсліць, што ў «Перамозе» заработная плата выплачваецца людзям рэгулярна, яны ўжо атрымалі яе за люты. А па выніках мінулага года яшчэ і трынаццатую, чатырнаццатую заработныя платы. Акрамя таго даплаты і падарункі ў час справаздачна-выбарнага сходу. Не былі пакрыўджаны пенсіянеры, ім выйшла па сто тысяч, не абыдзены ўвагай праўлення і жанчыны ў дзень 8 Сакавіка. Увогуле, такіх даплат і ўзнагароджанняў у год бывае шмат.

Але праўленню калгаса даводзіцца няпроста. Існуе яшчэ столькі інструкцый і пастаноў, якія не даюць магчымасці на справе пацвердзіць лозунг «Усё для людзей». Напрыклад, выпісаць чалавеку бясплатна трактар для апрацоўкі агарода, прывозкі дроў — адразу падатковая служба патрабуе ўплаты сваёй долі. Атрымліваецца, што плацяць двойчы.

У праўленні сем чалавек, на апошнім сходзе адмовіліся ад таго, каб па даўняй завядзёнцы былі ў ім меншы, а даярка. Па-першае, аператыўна не сабрацца, па-другое, даярка ніколі не прагаласуе аб пакаранні даяркі ж, хаця і ведае цудоўна аб яе паводзінах. Цяпер у праўленні толькі спецыялісты. Але іх дзеянні ў многім абмежаваныя.

Размовы ў калгасе пераканалі, што пераход ад падатку на зямлю да уніфікаванага падатку сельскагаспадарчых вытворцаў неабходны. На 120 калгаснікаў пры агульнай колькасці 470 жыхароў у калгасе ў мінулым годзе атрымалі на 3 мільярды 800 мільёнаў прадукцыі — гэта пры нізкіх, агульнавядома, закупачных цэнах. На чалавека па 33 мільёны рублёў. Сярэдняя зарплата ў месяц склала 800 тысяч. Прыбытак склаў 1003 мільёны рублёў, а падаткаў на гэты прыбытак выплачана 470 мільёнаў. Дык пра якую падтрымку можа ісці гаворка?

Павінен быць падатак на зямлю. І тады адразу будзе бачна, хто з гаспадароў на ёй як працуе. Цяпер жа больш прабіўны старшыня за кошт крэдытаў і дапамог можа паказаць, што ён яшчэ і гаспадар. Ды толькі за кошт каго? А на калгасы ж кладуцца самыя разнастайныя падаткі. Тая ж «Перамога» плаціць, і нямала, на ахову прыроды. Ды цыркулююць у Глыбокім упартыя чуткі, што некалькі соцень мільёнаў з гэтага падатку аддадзена адстаючым гаспадаркам на закуп камбікорму. Каб толькі кароў на фермах не падважваць. Нехта зноў жыве за кошт сапраўдных гаспадароў.

Размова з Алёнай Іосіфаўнай яшчэ раз пераканала, што сітуацыя ў сельскай гаспадарцы рэспублікі крытычная. Нават тут, дзе стараюцца не глядзець у бок дзяржавы, чакаючы дапамогі, дзе гэту дапамогу аддаюць своечасова, дзе ёсць свабодныя сродкі і на нейкі трактар, на дом для калгасніка, адчувальныя павевы безвыходнасці. Няма сапраўднай палітыкі ў гэтай вызначальнай галіне, няма падтрымкі тых, хто сапраўды выходзіць ці імкнецца выйсці з крызісу. Заўважце, Дзягель не просіць грошай, як гэта робіць большасць кіраўнікоў-аграрыяў. Яна просіць справядлівасці ў падаткаабкладанні, каб не трэба было хаваць тое, што ёсць сапраўды, просіць развязаць рукі і ўстанавіць нарэшце больш-менш рэальныя суадносіны паміж цэнамі. І тады «Перамога», ды і не толькі яна, стане сапраўднай карміцелькай, а не прасцількай, тады сціхнуць размовы аб тым, што «Захад нас накорміць».

Патрэбен апошні штрых. І ён ёсць. На справаздачна-выбарным сходзе ў калгасе прысутнічаў ксёндз, быў запрошаны і бацюшка, на жаль, не змог прыехаць. Каталіцкая частка жыхароў ужо займела памяшканне для адпраўлення службаў, праваслаўная з дапамогай калгаса хутка займее. Сама Алёна Іосіфаўна веруючая каталічка, але для яе няма адрознення, якога веравызнання чалавек, толькі б быў чалавекам.

Генрых НЕДЗВЕДЗЬ,
загадчык аграпрамаддзела «Весніка Глыбоччыны»;
Алесь КАСЦЕНЬ.

НАДЗЁННАЕ

ЗАКОН БУТЭРБРОДА Ў ПРЫМЯНЕННІ ДА НАЦЫЯНАЛЬНАЙ НАВУКІ

(Нататкі з сесіі агульнага сходу АН РБ)

Гэта той самы шырока вядомы закон, згодна з якім бутэрброд заўсёды падае маслам уніз. Пры чым тут навука? Дык вось жа якая справа: адбываецца самая прыметная на працягу года падзея ў жыцці нацыянальнай акадэміі — сесія агульнага сходу, а кіраўнікі рэспублікі якраз у гэты дзень паўдзельнічаць не могуць. Ніводзін. Ні Прэзідэнт, ні Старшыня Вярхоўнага Савета, якім было б што сказаць, ні нават уласны міністр. Магу засведчыць: абсалютна ў кожнага мелася ўважлівая прычына. Генадзь Карпенка, намеснік спікера парламента, выкраіў у другой палове дня дзве гадзіны, каб пабыць і выступіць — у агульным плане, галоўным чынам аб праблемах эканомікі...

Пакрыўдзіўшыся на начальства, удзельнікі сесіі адкрыта крыўдавалі і на прэсу — за тое, што амаль перастала асвятляць праблемы, якімі жывуць калектывы акадэмічных інстытутаў. Ды і ў зале прадстаўлена не густа...

Адным словам, над акадэміяй лунаў дух крэйсера «Вараг», які далёка ад родных берагоў (чытай: ад вачэй начальства і ўвагі грамадскасці) рабіў сапраўды гераічныя намаганні, каб утрымацца на плаву, не патануць. Прабачце мне такі вобраз, але ён дарэчы. І я крыху ніжэй паспрабую пераканаць паважанага чытача, што гэта так.

Характарызуючы сітуацыю, прэзідэнт АН Леанід Сушчэня азначыў пражыты год як «час цяжкіх выпрабаванняў». Асноўным вынікам ён лічыць тое, што ўдалося(!) пры ўсіх складанасцях захаваць эфектыўна дзеючую нацыянальную навуку. Але...

Але «чатыры гады ішоў працэс актыўнага разбурэння. Экспертныя прагнозы сведчаць: яшчэ два-тры гады сённяшніх стану і адносінаў да навукі кіраўнікоў дзяржавы і грамадства, народнай гаспадаркі, — навука будзе поўнасцю разбурана, яе фундаментальная частка поўнасцю страціць сваё значэнне».

Пасля гэтых слоў пачынаеш паіншаму глядзець на пустыя крэслы для высокага начальства ў прэзідыуме. І пачынаеш думаць нават зусім ужо крамольнае: а ці знайшлося б што сказаць, па вялікаму рахунку, нашаму Прэзідэнту сівагаловым нашым вучоным? Даўным-даўно і не адзін раз сцены гэтай залы чулі яго словы пра налогавыя льготы і ўвогуле прэзідэнцкі ўказ наконт дзяржаўнай падтрымкі навукі. З таго часу колькі разоў ён перапісваўся і дагэтуль не падпісаны... Хто, што трымае Прэзідэнта за руку — мінфінаўскі чыноўнік? Ці эканамічная сітуацыя? Але яе без навукі не выправіш.

Так што, на самай справе, калі ісці з пустымі рукамі, то лепш зусім не хадзіць. Словам ужо не вераць. «На словах, — міністр Л. Сушчэня, — кіраўнікі рэспублікі разумеюць, што навуковы патэнцыял з'яўляецца важным рэсурсам для рэспублікі і ад захавання яго залежыць наша будучыня».

Я зусім не маю на ўвазе «падставіць» Леаніда Міхайлавіча пад скосыя позіркі начальства. Проста «працэс зайшоў» так далёка, што не да ўзаемнай ветлівасці.

Але я абяцаў расказаць пра той гераізм, з якім акадэмія трымаецца на плаву. Лепш за ўсё пра гэта сведчаць старонкі гадавой абагульненай справаздачы інстытутаў. Пагартаем яе.

НДІ парашковай металургіі. Распрацаваны навуковыя прынцыпы стварэння матэрыялаў на аснове парашкоў чорных і каляровых металаў і сплаваў з павышанымі службовымі характарыстыкамі, у тым ліку высокатрывалай кераміці, сіталавай кераміці для эндапратэзавання.

Інстытут тэхнічнай кібернетыкі. Распрацаваны новы тып механізмаў для пераўтварэння зваротна-паступальнага руху ў вярчальны, прызначаных пераважна для рухавікоў унутранага згарання.

Акадэмічны навуковы комплекс «Інстытут цепла- і масаабмену імя А. В. Лыкава». Распрацавана на ўзроўні лепшых замежных аналагаў сістэма ранняй камп'ютэрнай дыягностыкі паталогіі малочнай залозы. Створаны і даследаваны новы тып цвёрдых сарбентаў для халадзільнікаў і цеплавых помпаў, які валодае адначасова ўласцівасцямі фізічнай адсорбцыі і не мае аналагаў.

Інстытут прыкладной фізікі. Створаны асновы тэорыі капілярнага кантролю порыстых матэрыялаў. Распрацаваны тэхналагічныя рэкамендацыі па выяўленню дэфектаў у порыстых матэрыялах.

Інстытут эканомікі. На аснове замежнага вопыту выпрацаваны канкрэтныя прапановы па найбольш эфектыўнаму ўдзелу беларускіх прадпрымальнікаў у стварэнні транснацыянальных фінансава-прамысловых груп...

Шчыра кажучы, я збіраўся даць для большай пераканаўчасці вялікі спіс распрацовак — хоць бы вось так, штрыхамі. Але зараз адчуваю, што можа і не варта гэтага рабіць. Усё роўна кніжку-справаздачу не пераплішаш — у ёй 200 старонак. Ды і ці трэба так доўга пераконваць чытача, што без навукі няма прагрэсу? Асабліва калі мець на ўвазе, што новыя тэхналогіі нам не падорыць і танк не прададуць.

У выступленні Генадзя Карпенкі прагучала лічба: летась знешнія інвестыцыі склалі 4 мільёны долараў. Амаль нічога. Так што да ўсяго трэба даходзіць уласнымі галовамі. А самыя светлыя сабраны тут, у акадэміі.

Праўда, за апошнія гады адбыўся грандыёзны адток кадраў у камерцыйныя структуры, за мяжу. Летась працэс быццам бы пайшоў на спад. Як гэта разумець? Адзін з маіх суседзяў у зале растлумачыў: моладзь пайшла, а старых ніхто не бярэ. Другі сумнавата пажартаваў: ды не, проста самая разумная разбегліся, засталіся самыя багатыя (хто атрымлівае аж па 800 тысяч). Акадэмік Л. Сушчэня лічыць, што засталіся «тыя, хто адданы навуцы і пакуль можа працаваць». Неяк зводзячы канцы з канцамі, кожны дзень адмаўляючы сабе і сем'ям у самым неабходным. Бо «велізарная» лічба ў 800 тысяч, што мы назвалі вышэй, — гэта не вклад прыбліжальчыцы або лабаранта, гэта заробак доктара навук, прафесара, — тых, хто вызначае ўзровень нацыянальнай навукі, глыбіню яе распрацовак. Як яшчэ крычаць пра гэта, каб «наверсе» пачулі? Ці сапраўды маюць рацыю тыя, хто сцвярджае, што сыты галоднаму не спагадае?

Так што закон, з якога мы пачалі, мае яшчэ адно тлумачэнне ў адносінах да акадэміі: яе супрацоўнікі ядуць у абед свой дзяжурны бутэрброд часта нават без масла.

Гонар і слава інстытутам, якім дазволіў профіль і якія «ўпісаліся» ў рынак, самі сябе кормячы. Але гэтую схему да ўсіх не прыменіш. Да тых жа інстытутаў гуманітарнага профілю. Ёсць і тут прыемныя выключэнні. Інстытут эканомікі амаль палову свайго фінансавання забяспечыў летась за кошт прыкладных даследаванняў. Калі абагульняць, то сёння акадэмія, хай сабе з вялікімі цяжкасцямі, але ж зарабляе для сябе палову грошай (дадзеныя прывёў акадэмік Андрэй Ганчарэнка), а другую палову ідзе на ўзнаўленне лепшых навукоўцаў і цэлых калектываў, якія склаліся ў храме айчыннай навукі, паслухаем самых удзельнікаў сходу.

Акадэмік Станіслаў Астапчык:

Грошай няма, таму бачу адзіны шлях. Трэба прыступіць да «шокавай тэрапіі»: пакінуць сапраўдных вучоных і пасадзіць іх на бюджэт. Гэта вельмі складана, але рана ці позна прыйдзецца рабіць. (Узнікае праблема: а хто не сапраўдны, як вызначыць? — **У. Х.**)

Акадэмік Аляксандр Падлужны:

Тры гады назад завяршылі работу над адным з тамоў «Славянскага лінгвістычнага атласа». Надрукаваць не можам. Гэта калектыўнае выданне славянскіх дзяржаў, і Расія ўжо выпусціла тры тамы, за якія адказвае. Польшча — таксама тры тамы. Нават ваюючая Югаславія свой том выпусціла ў свет. Украіна рыхтуе. А мы...

Або падрыхтавалі тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Але чаму інстытут павінен плаціць за яго паліграфічнае выданне вялікія грошы (якіх няма), калі слоўнік патрэбен усім — і настаўніку, і вучню, і дзяржаўнаму чыноўніку... Гэта інтарэсы дзяржавы, яе прэстыж.

Член-карэспандэнт АН Міхаіл Піліпенка:

Зусім рэальная небяспека знікнення некаторых навук. У Інстытуце этнаграфіі і фальклору сабраны прадстаўнікі адразу пяці навук. Гэта архаічна, каб у адным інстытуце было прадстаўлена 5 навук. Тым больш што па некаторых з іх працуе зусім мала навукоўцаў. Фалькларыстыка — 11, этналогія — 9, антрапалогія — 5, этнамузыкалогія — 2(!).

Чатыры гады не было экспедыцый (мінулы год стаў шчаслівым выключэннем). Тыя з'явы, якія фіксуюцца менавіта ў экспедыцыі, з цягам часу знікаюць, і калі зараз не паспець, потым будзе позна. Разбураюцца помнікі гісторыі і культуры, паміраюць або выязджаюць людзі — носьбіты нейкіх адметных асаблівасцей у культуры свайго краю. Зараз гэта востра адчуваецца ў сувязі з наступствамі аварыі на ЧАЭС. І трэба спяшацца.

Доктар навук Эрнест Ляўкоў:

Сродкі масавай інфармацыі апошнім часам не пішуць аб нашых праблемах, дасягненнях вучоных. У газетах ёсць аб экстрасенсах, аб псеўданавуках, аб шамане з Чукоткі, які прыехаў у Мінск і сабраў тысячную аўдыторыю. А мы сядзім і маўчым, ніяк гэты «тэатр абсурду» не каменціруем. Давайце не чакаць, пакуль нехта раскажа аб нашых праблемах, а раскажам аб іх самі.

* * *

Падсумуем. Удзельнікі сесіі агульнага сходу засведчылі: беларуская навука яшчэ жывая. У яе пакуль што стае сіл на генерыраванне сур'ёзных ідэй. Але калі з боку дзяржавы не будзе прынята тэрміновых і рашучых мераў па падтрымцы, у першую чаргу фундаментальных даследаванняў, поўнае разбурэнне айчыннай навукі непазбежнае. Калі канкрэтна, то навуковую грамадскасць трывожыць тое, што сёлета фінансаванне навукі будзе ажыццяўляцца ў памеры 0,6 працэнта ад валавога ўнутранага прадукту. І што існуе рэальная перспектыва адкрыцця фінансавання рэспубліканскіх праграм толькі ў лістападзе. А як працаваць цэлы год?

Уладзімір ХІЛЬКЕВІЧ,
аглядальнік «Звязды».

ПАСПРАЧАЕМСЯ?

ЗЯМЛЯ ЗНОЙДЗЕ САБЕ ГАСПАДАРА

Дзесяткі гадоў мы ўнушалі сабе, што толькі калгасы і саўгасы здольны забяспечыць насельніцтва прадуктамі харчавання, а прамысловасць — сыравінай. Такой думкі прытрымліваўся і я. Але, як бачым, рэчаіснасць даказала, што ўсё гэта зусім не так. І па доказ далёка хадзіць не трэба.

Усе мы ведаем (зразумела, хто хоча ведаць), што ў Нямеччыне на душу насельніцтва прыпадае 16 сотак зямлі, у нас жа — 60. І, тым не менш, яны сябе не толькі забяспечваюць харчаваннем, але і ў нейкай меры абмяжоўваюць вытворчасць. А мы?.. Колькі ні змагаемся, колькі ні ўздымаем, колькі ні ўмацоўваем і дапамагаем калгасам, а ўсё чагосьці не хапае. Усё шукаем гаспадара. А дзе ён, той наш гаспадар? Выехаў куды, захварэў ці мо спіўся, што ён, сам не бачыць, што ў нас столькі непаладак? А мы самі хто?

Пры тым у іх там, на Захадзе, вдзён фермер корміць больш як 100 жыхароў сваёй краіны, а наш аграрый — менш дзесяці. А мо яны там галадаюць, таму што вельмі высокія цэны? Дык жа не. У іх там не толькі ніжэйшыя цэны, але і заробкі ў некалькі разоў вышэйшыя. А таму, калі жыхар той жа Нямеччыны на прадукты харчавання траціць пятую частку сваіх даходаў, то мы — дзве трэці. Дык у чым жа справа?

А справа ў тым, і ў гэтым я пераканаў, што ў іх там зямля з'яўляецца таварам. А гэта значыць, што яе можна як купіць, так і прадаць. І натуральна ж п'яніца, гультай, няўмека яе прадасць. Пойдзе на лягчэйшы хлеб. А хто купіць?.. Другі такі? Не, яе купіць працавіты, дбайны гаспадар.

Такім чынам, як бачым, зямля сама падбірае сабе гаспадара. А таму ён ёй і служыць. Больш таго, купляючы зямлю, ён купляе і прадукт сваёй працы. А таму, уклаўшы свае грашовыя сродкі, ён укладвае не толькі сваё майстэрства і ўменне, але душу і сэрца.

У нас жа яна, як уласнасць дзяржавы, знаходзіцца ў руках дзяржавы. Значыць, і прадукт працы таксама ў першую чаргу належыць ёй, дзяржаве. Ну, а кожная дзяржава, як вядома, цалкам і поўнасцю кіруецца служачымі. А служачы ўжо, як даверaная асоба, выбірае гаспадара. А таму і служыць ён ужо не зямлі, не сваёй справе, а дзяржаве, і перш-наперш — таму служачаму, які яго паставіў. І зразумела: ён яго не толькі паставіў, але можа і зняць. Да таго ж і памер узнагароды вызначае. У выніку чаго і маем тое, што маем: «Служка служцы, а пану — трасца». Чаму трасца? На гэта адказвае другая прымаўка: «Прыйшоў пан — чашы клін, пайшоў пан — за ім кінь». А гэта азначае, што калі начальніка няма, то можна крыху і расслабіцца — пасядзець, пакурыць, а то і... па чарцы прапусціць. Ну проста... як у гасцях. Такое ўласніку і ў сне не прысніцца. Тым больш, што як трапна заўважыў адзін з такіх «працаўнікоў», «яшчэ і на хлеб даюць». З-за таго напэўна многія з нас і сумуюць па тых часах. І, па меры магчымасці, усяляк стараюцца калі не вярнуць, то хоць бы неяк наблізіць іх да сябе.

І сапраўды, ёсць па чым сумаваць: уласніку свая справа такой раскошы не дазваляе. Яна ад сябе яго ні на адзін крок не адпускае, фіксуе кожны рух яго, кожны крок. Яе не падкупіш і не ашукаеш; памылкі яна не дарае і доўг не спіша; пагроз не баіцца і на абяцанні не рэагуе.

Прызнае і рэагуе толькі на рэальны ўклад у справу. Сумеў, пастараўся, уклаў — і ты багаты. А разам з табой і дзяржава. Можна і дапамагчы бяднейшаму, слабейшаму, калеку, пенсіянеру. А не сумеў, не пастараўся, не ўклаў — і ты банкрут, бядняк. Прасі, чакай дапамогі. А не хочаш быць бедным, прасіць, ідзі шукай іншай работы, па сваіх здольнасцях, характару, вучыся.

А зараз давайце падумаем: каму лепш жывецца — ім там пры асабістай уласнасці ці нам тут — пры дзяржаўнай? І, галоўнае, вызначымся, як лепш? Аддаць зямлю ва ўласнасць з правам купляць і прадаваць тым, хто яе апрацоўвае, а самім жыць з іншых даходаў і плаціць за прадукты харчавання калі і не 20 працэнтаў, як яны там, ад сямейных даходаў, то, прынамсі, працэнтаў 30—40 ад сваіх, ці пакінем яе за дзяржавай, у руках чыноўнікаў, а разам з тым і на прадукты харчавання будзем выдаваць 60—70 працэнтаў. На практыцы гэта выглядае так, і будзе выглядаць у далейшым, што іхні там беспрацоўны за кошт дапамогі, можа, і будзе мець магчымасць ездзіць на аўтамашыне, а наш, працуючы, часам вымушаны ў перапоўненым аўтобусе ездзіць зайцам або недаядаць.

Адчуваю пярэчанні накшталт: а навошта нам думаць? На гэта ж ёсць адпаведныя ўлады, Вярхоўны Савет, шмат усякіх там інстытутаў, вучоных — вось няхай і думаюць. А мы — людзі маленькія...

І сапраўды, навошта нам думаць, калі яны там, наверсе, думаюць. І напэўна нешта прыдумаюць. Але ж, мяркуючы па ўсім, апошнюю кропку ў выглядзе рэферэндуму прыйдзецца ставіць нам, простым людзям. А калі, барані нас Бог, мы і на гэты раз памылімся, пабаімся, каб нехта не разбагацеў ды не скупіў вакол нас усю зямлю, а тым самым і не перавёў усіх нас з «паноў» у батракоў, і паставім гэту самую кропку не там, дзе трэба, то і зямля наша надалей застанецца без гаспадара. Проста ўдавой.

А мы?.. Мы, натуральна, узмоцнена будзем змагацца за пад'ём сельскай гаспадаркі. А на практыцы — таптацца на месцы.

Вось і хацелася б не толькі падзяліцца сваімі меркаваннямі, але і ўзбагаціць яе іншымі. Процілеглымі. Дакладней кажучы, абмеркаваць яе на старонках «Звязды».

Крыху пра сябе. Нарадзіўся я ў вёсцы Есьманоўцы Вілейскага раёна. У свой час закончыў 7 класаў польскай школы. А праз некалькі гадоў і кароткатэрміновыя курсы па эфектыўнаму вядзенню сельскай гаспадаркі. Натуральна ж, галоўным заняткам была дапамога бацькам па вядзенню сваёй асабістай гаспадаркі. У 1939 годзе мяне прызвалі ў Войска Польскае. У час вайны ў адным з жорсткіх баёў трапіў я ў палон і апынуўся на прымусовых работах у нямецкіх баўэраў. Спачатку ва Усходняй Прусіі, а пасля на Захадзе, у правінцыі Шлезвіг-Гольштэйн. Гаспадароў было шмат — добрых і дрэнных. Прыглядаўся, як яны працуюць. Вывучаў і засвойваў усё з тым, каб, калі дасць Бог жывым вярнуцца дамоў, гэта выкарыстаць у сябе дома, у сваім калгасе. А калі вярнуўся, то аж ахнуў ад здзіўлення. Тут міжволі даведаўся, што калгасніку ніякіх ведаў не трэба. Тут за вяскоўцаў думаюць у раёне, вобласці і вышэй. А Ім толькі заставалася ўважліва слухаць і выконваць загады. А таму мне прапанавалі працаваць у мясцовым сельпо або на нарыхтоўцы лесу ў Карэла-Фінскай ССР. Я выбраў сельпо. Закончыў планава-эканамічны тэхнікум і застаўся «гандляром». Аднак цікавасць да сельскай гаспадаркі мяне не пакідала і не пакідае.

Ілья СЯЛЯЎКА,
в. Есьманаўцы, Вілейскі раён.

НАПЯРЭДАДНІ

Плануецца святкаванне ўгодкаў стварэння БНР

Яшчэ зусім нядаўна Беларуская Народная Рэспубліка, абвешчаная 25 сакавіка 1918 года, называлася сярод папярэднікаў беларускай дзяржаўнасці. Сёння ў большасці магчымых выпадкаў узгадванне каравёў нацыянальнага суверэнітэту пра гэта саромліва маўчаць. 25 сакавіка застаецца святам, калі можна так сказаць, грамадскім, неафіцыйным. Сёлета спаўняецца 78 гадоў з дня абвяшчэння БНР. Створаны грамадскі арганізацыйны камітэт па святкаванню чарговых угодкаў. У саставе аргкамітэта — вядомыя грамадскія і палітычныя, а таксама дзяржаўныя дзеячы. У іх шэрагу — Генадзь Карпенка, Станіслаў Багданкевіч, Рыгор Барадулін і іншыя. На чале аргкамітэта — вядомы пісьменнік Васіль Быкаў. Мы звярнуліся да Васіля Уладзіміравіча з просьбай адказаць на некалькі пытанняў напярэдадні 78-й гадавіны БНР.

— Якія мерапрыемствы плануе правесці аргкамітэт?

— 24 сакавіка, у нядзелю, плануецца правядзенне ўрачыстага шэсця і мітынгу на плошчы Незалежнасці.

— Ці не супраць гэтых мерапрыемстваў Мінскі гарвыканком?

— У нас у краіне ўзровень права знаходзіцца на такім узроўні, што ўсё можа быць. Але ж мы рухаемся, развіваемся. Краіна ідзе па шляху прагрэсу і дэмакратыі. Гарадскія ўлады павінны ўлічыць і гэта,

У ДОМЕ ДРУКУ ЧАРГОВЫЯ КАДРАВЫЯ ПЕРАСТАНОЎКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

газеты, аб разглядзе кандыдатуры Галко разам з кандыдатурай Шыманскага. А на планёрцы, якую, дарэчы, праводзіў яшчэ М. Галко, нават гучалі заклікі не выпускаць сённяшні нумар газеты і ўсяму калектыву звольніцца. Сам М. Галко лічыць тое, што адбылося, паляваннем не на яго асабіста, а на «Народную газету» ў цэлым.

Уладзімір Замяталін у сваю чаргу паўтарыў карэспандэнту «Звязды» тыя словы, якія сказаў учора раніцай у рэдакцыі «НГ». Ён заявіў, што выданне не павінна быць газетай аднаго чалавека, адной партыі ці адной фракцыі. «Народная газета», на думку намесніка кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, павінна «ўлічваць палітычныя працэсы і тэндэнцыі, якія адбываюцца ў краіне», а таксама «паважаць вынікі рэферэндуму».

Такім чынам, развязка ўчарашніх падзей павінна наступіць на бліжэйшым пасяджэнні сесіі парламента, які павінен вырашыць як лёс газеты, так і асобу яе рэдактара. Але ў Вярхоўным Савеце таксама не існуе адзінай думкі наконт праблемы. Як вядома, старшыня Камісіі па правах чалавека, нацыянальных пытаннях, СМІ, сувязях з грамадскімі аб'яднаннямі і рэлігійнымі арганізацыямі Ігар Катляроў быў адным з актыўных прыхільнікаў ідэі замены галоўнага рэдактара «Народнай газеты». Спасылаючыся на свае сацыялагічныя даследаванні, ён заяўляў пра «НГ» як пра выданне самае неаб'ектыўнае і нават неаднаразова ўступаў на старонках газеты ў спрэчку з Галко.

Але вось намеснік Катлярова Уладзімір Нісцюк мае зусім процілеглую думку. Ён лічыць, што Вярхоўны Савет павінен «узаконіць» на пасадзе М. Галко. Гэта зніме напружанасць у калектыве, не зменшыць якасць і тыраж газеты. «Нельга мяняць рухавік на самалёце, які ляціць», — падкрэсліў дэпутат.

Наўрад ці пазіцыя І. Катлярова адлюстроўвае пазіцыю ўсёй фракцыі камуністаў, а думка У. Нісцюка — усёй сацыял-дэмакратычнай фракцыі «Саюз працы». Але, мяркую, што ў галасаванні камуністы разам з аграрыямі падтрымаюць кандыдатуру Шыманскага. Гэта разумеюць, здаецца, усе. Таму ўчора я застаў Мікалая Галко за тым, што ён збіраў свае паперы...

Юрась ЛЯШКЕВІЧ.

У МЕТРАПАЛІТЭН — З ПЛАСТЫКАВЫМ ПРАЯЗНЫМ

Як паведамілі ў вытворчым упраўленні транспарту і сувязі Мінгарвыканкома, з 1 красавіка ў сталічным метрапалітэне ўводзяцца ў абарот пластыкавыя праязныя дакументы.

Новыя праязныя шматразовага выкарыстання пакуль не абмяжоўваюць колькасць паездак і сапраўдныя да 1 чысла наступнага месяца. Для прадаўжэння дзеяння іх неабходна будзе перакадзіраваць у касіра на любой станцыі «падземкі».

У бліжэйшы час мяркуецца не браць з грамадзян залогавага кошту пластыкавай карткі, каб пазбегнуць магчымых пралікаў, звязаных з іх эксплуатацыяй. Падобныя эксперыменты з уязджэннем у метрапалітэнах пластыкавых праязных ужо праводзяцца ў Кіеве і Санкт-Пецярбургу. Але, у адрозненне ад Мінска, у Кіеве выкарыстоўваюцца аднаразовыя праязныя, прычым аплачваецца як кошт праезду, так і сабекошт самой карткі.

Мінгарвыканком ужо ў красавіку плануе забяспечыць усіх жадаючых новымі праязнымі, выключэнне могуць скласці толькі арганізацыі, якія набываюць для сваіх работнікаў праязныя дакументы па безнаяўнаму разліку ў кіёсках «Саюздруку». Магчыма, першы час ім давядзецца карыстацца старой формай метрапалітэнаўскага праязнога. Але гэта ненадоўга, толькі да таго часу, пакуль не будзе распрацаваны адпаведны механізм набыцця імі пластыкавых праязных. Сёння ўжо распрацоўваюцца яшчэ 8 відаў камбінаваных пластыкавых праязных білетаў на метро і іншыя віды транспарту.

Застаецца дадаць, што новыя праязныя распрацаваны і вырабляюцца Мінскім навукова-даследчым прыборабудаўнічым інстытутам. І кошт іх застанецца ранейшым — 65 тысяч рублёў.

Надзея НІКАЛАЕВА.

У МІНСКУ РЫХТУЮЦЦА АДЗНАЧЫЦЬ 78-я ЎГОДКІ БНР

Мінскі гарвыканком даў дазвол на правядзенне ў сталіцы ўрачыстасцей з нагоды 78-х угодкаў абвяшчэння Беларускай Народнай Рэспублікі. Разам з тым без пэўных карэкціровак намераў нацыянальнага камітэта па святкаванню гадавіны БНР (нагадаем, што ўзначальвае яго Васіль Быкаў) не абышлося.

Так, паводле задумы членаў нацыянальнага аргкамітэта, святкаванне меркавалася пачаць 24 сакавіка са збору на сталічнай плошчы Незалежнасці. Далей калона павінна была рушыць па праспд. Ф. Скарыны да сквера Янкі Купалы, дзе і планавалася правесці мітынг. Аднак у гарвыканкоме ўзгадалі, па-першае, што галоўная плошча краіны мае асобы статус, а па-другое, што перакрываць рух транспарту ў цэнтры Мінска немэтазгодна, і прапанавалі ініцыятарам акцыі правесці толькі мітынг. Месцам яго правядзення вызначана плошча Парыжскай Камуны, што знаходзіцца каля будынка опернага тэатра. Мерапрыемства, паводле заяўкі аргкамітэта, пачнецца 24 сакавіка ў 13 гадзін.

Сяргей ГРЫБ.

КРЫМІНАЛ

38 КІТАЙЦАЎ

У канцы мінулага тыдня каля вёскі Залужжа Стаўбцоўскага раёна мясцовая міліцыя знайшла аўтафургон «Сканія» з чэшскімі нумарамі і вельмі цікавым грузам.

Першым заўважыў таямнічую машыну ў дзве гадзіны ночы начальнік участка дарожнай міліцыі капітан Віктар Протас. Яна стаяла пасярод шашы без уключаных габарытных агеньчыкаў, без пломбаў на дзверцах кузава, ды і вадзіцеля таксама не было. Пасвяціўшы ліхтаром, афіцэр убачыў у фургоне вялікія пакункі з ватай, а за імі — незразумелыя мітуслівыя цені.

Калі на дапамогу прыехала выкліканая з райаддзела група, то перад вачыма здзіўленых міліцыянераў паўсталі... 38 кітайцаў. Аказалася, што нехта згадзіўся даставіць азіятаў да польска-беларускай мяжы для нелегальнага пераходу, але потым збег разам з платай за паслугу.

НЕБЯСПЕЧНЫ ХЛЕБ ТАКСІСТА

На прадстаўнікоў гэтай прафесіі сталі нападаць не толькі ўвечары, але і раніцай, аб чым сведчаць два выпадкі ў Ленінскім раёне Мінска, што адбыліся ў адзін дзень.

Спачатку чацвёра злачынцаў глыбокай цемрай абрабавалі таксіста на вуліцы Пляханава, адабраўшы 490 тысяч рублёў выручкі. Іх пакуль адшукваюць.

Затое затрымалі «ранніх пташак», якія ў 7.00 на вуліцы Якубава пад пагрозай нажа адабралі ў шафёра 19 долараў і 80 тысяч рублёў. Аператыўнікі даставілі ў аддзел рабочага ЖЭСа і трох непаўналетніх.

ПАЦЯГНУЎСЯ ЛАНЦУЖОК РАЗБОЯЎ

11 сакавіка быў арыштаваны супрацоўнікамі крымінальнага вышуку сталічнага УУС і Першамайскага РАУС малады, раней судзімы злодзей, а потым тая ж доля напаткала і трох яго сяброў-рэцыдывістаў.

На іх сумленні шэраг нападаў на кватэры мінчан. Следства высветліла падрабязнасці чатырох з іх . Вось як дзейнічалі злачынцы, напрыклад, у красавіку мінулага года.

Адзін з рабаўнікоў меў міліцэйскую форму, таму гаспадар адчыніў на званок дзверы. Яны ўдарылі яго па галаве гумавай палкай і надзелі наручнікі. Вынеслі з кватэры відэамагнітафон і 10 касет да яго, прайгравальнік, 15 кампакт-дыскаў, а таксама 4400 долараў.

Сяргей ХРЫПАЧ, прэс-цэнтр МУС.

МАГНАТБАНК MAGNATBANK

«Белорусский акционерный коммерческий банк «Магнатбанк» сообщает, что общее собрание акционеров состоится 22 марта 1996 года по адресу: *г. Минск, ул. К. Либкнехта, 68. Начало в 10.00.*

СУПРАЦЬ ПАВОДКІ — УСЁЙ ГРАМАДОЙ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

затораў лёду з рэзкімі пад'ёмамі ўзроўняў вады, у выніку чаго яна можа падтапіць населеныя пункты і пашкодзіць гідратэхнічныя маставыя і дарожныя збудаванні.

І хаця прагнозы гідраметэаролагаў адносна веснавой паводкі ў басейнах Дняпра і Сожа больш аптымістычныя, аднак і тут не выключана падтапленне дамоў шэрага вёсак на ўчастку Рэчыца—Лоеў, а таксама ў Гомелі і ўсходняй украіне Добруша, як гэта мела месца ў 1994 годзе.

Аб прагнозах можна гаварыць і болей, але гэта толькі тэорыя. А стыхія, і мы гэта ўжо добра ведаем, і ёсць стыхія, бо яна ў многіх выпадках непрадказальная. Таму лепш задацца пытаннем, як думаюць сустракаць яе на Гомельшчыне і прадухіліць або зменшыць яе магчымыя ўдары.

Створаны штаб па паводцы, які ўзначальвае старшыня аблвыканкома Павел Шыпук. Рабочым органам яго вызначаны штаб грамадзянскай абароны. На пасяджэнні абласной камісіі па надзвычайных сітуацыях заслуханы кіраўнікі адпаведных службаў — дарожнікаў, сувязістаў, энергетыкаў і г. д. Для абароны ад затаплення населеных пунктаў падрыхтаваны ўжо 560 кубаметраў каменю, 12 тысяч — гравію, 11 тысяч — шчэбеню, пяць тысяч кубаметраў піламатэрыялаў. Выдзелены сродкі для падсыпкі дамбы польдэрнай сістэмы каля вёскі Белае Балота Рэчыцкага раёна.

У поўнай гатоўнасці знаходзіцца інжынерная тэхніка — 98 экскаватараў, 85 бульдозераў, 83 трактары, 66 скрэпераў, 37 аўтакранаў. Ужо створаны аварыйна-аднаўленчыя брыгады з дарожнікаў, энергетыкаў, сувязістаў і іншых катэгорый работнікаў для кругласутачнай работы, падрыхтаваны 1032 адзінкі аўтамабільнай тэхнікі, 78 грузавых фургонаў для перавозкі жывёлы, 8 катэраў, 5 паромаў, 1541 лодка. На час паводкі будзе падвоена колькасць гідралагічных пастоў.

Нядаўна ў вобласці прайшла штабная трэніроўка са штабамі грамадзянскай абароны і камісіямі па надзвычайных сітуацыях у раёнах, у час якой была праверана гатоўнасць сіл і сродкаў, інжынерна-тэхнічных службаў раёнаў і гарадоў па ліквідацыі вынікаў паводкі і максімальнаму змяншэнню матэрыяльных страт ад яе народнай гаспадаркі і насельніцтва. З лепшага боку сябе тут паказалі спецыялісты Жыткавіцкага, Калінкавіцкага, Мазырскага, Лоеўскага і Акцябрскага раёнаў. Горшыя ў гэтым плане справы ў Брагінскім, Ельскім і Лельчыцкім раёнах. Праверка гатоўнасці адной з вайсковых часцей па падрыхтоўцы плавучых сродкаў засведчыла, што тут — поўны парадак.

— Толькі буйных аўтамабільных мастоў у вобласці каля пятнаццаці, — расказвае выконваючы абавязкі начальніка штаба грамадзянскай абароны вобласці палкоўнік Анатоль Яфіменка. — Каб яны не былі пашкоджаны, інжынерна-сапёрныя падраздзяленні Міністэрства абароны рэспублікі да крыгаходу ўзарвуць лёд. Яны ўжо гатовы да гэтага.

У раёнах складзены планы эвакуацыі насельніцтва з вёсак, якія, магчыма, будуць падтоплены, а ў тых, што будуць адрэзаны вадой і дзе людзі будуць жыць, створаны запасы прадуктаў харчавання і тавараў першай неабходнасці. У бяспечныя месцы ўжо вывезена 32,5 тысячы тон кармоў для жывёлы, створаны запас гаруча-змазачных матэрыялаў.

Падрыхтоўчыя работы да паводкі — а іх цэлы комплекс — праводзяцца на Гомельшчыне і зараз. Час пакажа, наколькі яны будуць эфектыўнымі, калі, крый Божа, стыхія разгуляецца ва ўсю сваю неўтаймаваную сілу.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

ПАРТЫЗАНСКАМУ І ЗАВОДСКАМУ РАЁНАМ МІНСКА ПАГРАЖАЕ ПАВОДКА

На Беларусі ўжо амаль на працягу 10 гадоў не было такой снежнай і марознай зімы. Паводле даных намесніка старшыні Мінгарвыканкома Пятра Сямашкі, снежнае покрыва на тэрыторыі Мінска складае 50—60 см. У выніку зацяжных і моцных маразоў зямля прамерзла на глыбіню 80—130 см, а таўшчыня лёду на рацэ Свіслач і гарадскіх вадаёмах дасягае паўметра. Гэтыя даныя ствараюць рэальныя прадпасылкі для ўзнікнення даволі цяжкіх умоў па пропуску паводкавых вод.

Па прагнозах спецыялістаў, на Вілейска-Мінскай воднай сістэме чакаецца прыток вады, які на 40—50 працэнтаў перавышае існуючыя нормы. Небяспека паводкі пры імгненным пацяпленні існуе ў асноўным на ўчастках Партызанскага і Заводскага раёнаў, а таксама на асобных нізкіх мясцінах Цэнтральнага раёна горада. Пад пагрозай частковага затаплення, па ацэнках спецыялістаў камунальнай гаспадаркі, знаходзяцца 100—120 дамоў прыватнага сектара. Усяго па Мінску адзначана 235 месцаў найбольш верагоднага затаплення. У сувязі з гэтым уладамі горада прыняты самыя рашучыя і неабходныя меры па папярэджанню паводкі.

Так, на сённяшні дзень у ланцугу вадасховішчаў Мінска-Вілейскай воднай сістэмы дасягнута зніжэнне ўзроўню вады ад нармальнай адзнакі на 160 см. Праведзена рэвізія і ачыстка водапрыёмных калодзежаў і ўчасткаў ліўневай каналізацыі горада. Рыхтуюцца матэрыялы для аховы наяўных у горадзе дамбаў і плацін. Створаны і сканцэнтраваны брыгады спецыяльнай водаадпампоўвальнай і землярыйнай тэхнікі. Ужо цяпер яны знаходзяцца ў поўнай гатоўнасці і размясціліся пры жыллёвых аб'яднаннях і дарожных участках кожнага з небяспечных раёнаў. На гэтых участках распрацаваны канкрэтныя мерапрыемствы па капанню канаў і ўсталяванню часовых латкоў. Работнікамі камунальнай гаспадаркі праводзіцца растлумачальная работа з жыльцамі кожнага дома, якім пагражае небяспека падтаплення.

Мэрыяй горада зарэзераваны месцы ў гасцініцах сталіцы, дзе грамадзянам у выпадку няшчасця будуць прадастаўлены ўсе неабходныя ўмовы. У гарвыканкома на такія мерапрыемствы існуе рэзервовы фонд у памеры 15 млрд. рублёў.

Калі жадаеш лепшага, рыхтуйся да горшага. Але прагнозы спецыялістаў могуць і не апраўдацца. На думку Пятра Міхайлавіча, калі пацяпленне не адбудзецца ў кароткія тэрміны, а расцягнецца хоць бы на 10 дзён, каналізацыя горада ў гэтым выпадку без цяжкасці справіцца з дадзеным аб'ёмам вады. А Мінску ніякае затаплення пагражаць ужо не будзе.

Сяргей КУРКАЧ.

УЖО СЁННЯ МАГІЛЯЎЧАНАМ РАЯЦЬ: БЕРАЖЫЦЕ ДЗЯЦЕЙ І ХАВАЙЦЕ БУЛЬБУ

Незвычайная па маштабах веснавая паводка чакаецца сёлета ў Магілёве. Не выключана, што пасля разліву Дняпра ў вадзе могуць апынуцца не менш як паўтысячы дамоў прыватнага сектара.

Для ліквідацыі магчымых наступстваў паводкі пры мясцовым гарвыканкоме створана надзвычайная камісія, пад кантролем якой у «баявую» гатоўнасць прыводзяцца спецыяльная выратавальная рота ўнутраных войскаў, вайсковыя падраздзяленні, міліцыя, ДАІ. Камунальныя службы Магілёва тэрмінова прачышчаюць сцёкавую каналізацыю, а ў рачным порце ўжо падрыхтаваны два цеплаходы, што як ледаколы будуць крышыць лёд у месцах яго скоплівання на Дняпры. На выпадак часовага адсялення насельніцтва бранёруюцца месцы ў гарадскіх гасцініцах і інтэрнатах.

Апроч таго вядзецца папераджальная работа з насельніцтвам. У прыватнасці, падчас паводкі магілёўчанам забаронена адпускаць на Дняпр дзяцей, а тым з гараджан, што жывуць у прыватным сектары, ужо зараз мясцовыя ўлады раяць выцягнуць са склепоў бульбу і іншыя прадукты харчавання.

Сяргей ГРЫБ.

ТАА «Белена» ЛІКВІДУЕЦЦА. Прэтэнзіі прымаюцца на працягу 2 месяцаў. *Тэл. (0172) 54-26-55.*

СПОРТ-ЭКСПРЭС

Англічане лічаць, што ў футболе важна не толькі забіваць мячы, але і забяспечыць парадак

Да чэмпіянату Еўропы па футболу яшчэ тры месяцы, а англічане, гаспадары турніру, ужо гатовы да прыёму гасцей І... балельшчыкаў, з якімі на англійскіх стадыёнах у час паядынкаў звычайна здараюцца казусы ў выглядзе дробных боек, а падчас і вялікіх крывавых пабоішчаў.

Таму, каб застрахавацца ад хуліганскіх выхадак, улады Вялікабрытаніі ўжо падрыхтавалі асаблівую праграму для тых, хто ў параўнанні з футболам аддае перавагу звычайным папойкам і разборкам на трыбунах. Адзін з варыянтаў супакаення запалу задзірак — спецыяльны звод пакаранняў за тыя ці іншыя выхадкі на футбольных стадыёнах у час гульняў «Еўра-96». Балельшчыкі разам з білетамі будуць атрымліваць спецыяльныя лістоўкі, у якіх чорным па беламу, на трох мовах — англійскай, французскай і нямецкай — напісана, што пранос на стадыёны дамавых і запальных шашак, а таксама спіртнога забаронены.

Усе выпадкі хуліганства ўлады плануюць разбіраць хутка і цырымоніцца з непаслухмянымі балельшчыкамі не збіраюцца. Калі вінаваты — то адразу за краты. Гэта ў поўнай меры датычыцца і замежных грамадзян. Усё ж, лічаць арганізатары турніру, на гульнях павінен быць парадак, паколькі заўзятыя фанаты-задзіракі трапіць на футбол не павінны, бо імёны найбольш злосных хуліганаў з іншых еўрапейскіх краін будуць унесены ў камп'ютэрныя дасье. І калі такі «экзэмпляр» трапіцца паліцыі ці іміграцыйным службам на вочы, то яму, хутчэй за ўсё, будзе адмоўлена ва ўездзе ў краіну. Для поўнай бяспекі і нармальнай арганізацыі парадку на перыяд чэмпіянату адкрыю дзверы ў Скотланд-Ярдзе спецыяльны цэнтр, у якім будуць працаваць прадстаўнікі паліцэйскіх упраўленняў еўрапейскіх краін.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

СЁННЯ

СОНЦА

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск –	6.13	18.22	12.09
Віцебск –	6.03	18.12	12.09
Магілёў –	6.02	18.11	12.09
Гомель –	5.57	18.10	12.13
Гродна –	6.26	18.39	12.13
Брэст –	6.29	18.37	12.08

МЕСЯЦ

Маладзік 19 сакавіка.

ІМЯНІНЫ

Пр. Васіля, Яфрэма, Капітона, Яўгенія, Паўла, Еміліяна

К. Маўрыцыя, Клаўдзія

НАДВОР'Е

Сёння ўдзень па рэспубліцы чакаецца пераменная воблачнасць, у паўднёвых раёнах пройдзе слабы снег. Тэмпература паветра ў Мінску, Брэсце, Гомелі — 0—2, Гродне — 1—3, Магілёве, Віцебску — 2—4 градусы цяпла.

У наступныя двое сутак чакаецца воблачнае з праясненнямі надвор'е. 21-га — у паўднёвых раёнах, 22-га — месцамі па рэспубліцы невялікі снег. Тэмпература ўначы — 5—10 градусаў марозу, удзень — мінус 2 — плюс 3.

Медыцынскі прагноз надвор'я на 20 сакавіка

У бліжэйшыя суткі сінаптычная сітуацыя істотна не зменіцца. Паранейшаму паяўленне выражаных метэапатычных рэакцый у большасці метэазалежных хворых не чакаецца. Рэкамендацыі па прафілактыцы самаадчування тыя ж: пашырыць фізічную актыўнасць, рабіць прагулкі на свежым паветры, прымаць полівітаміны.

Антаніна КАРОЗА, навуковы супрацоўнік БелНДІ кардыялогіі.

У СВЕЦЕ

ПЕЛЕНГ-НАВІНЫ

КАШМАР СКОНЧЫЦЦА Ў КРАСАВІКУ?

У Чачні працягваюцца жорсткія баі паміж федэральнымі войскамі і сіламі Джахара Дудаева. Расійскай арміі пакуль не ўдаецца захапіць паселішча Сямашкі і прарваць абарону чачэнцаў вакол сяла Бамуд. У Бруселі адна з праваахоўных арганізацый абвінаваціла абодва баючыя бакі ў сур'ёзных парушэннях правоў чалавека. У дакладзе арганізацыі адзначаецца, што федэральныя войскі без разбору абстрэльваюць жылыя раёны. З іншага боку, чачэнцы вядуць баі, прыкрываючыся палоннымі як жывымі шчытамі. Нягледзячы на жорсткія сутыкненні, міністр абароны Расіі Грачоў аб'явіў, што ў красавіку пачнецца вывад з Чачні падраздзяленняў федэральнай арміі. Адказваючы на пытанні журналістаў у Маскве, Грачоў зноў абвергнуў чуткі пра сваю магчымую адстаўку. 18 сакавіка пазіцыі федэральных войскаў Чачні абстрэльваліся дудаеўскімі баевікамі 16 разоў. У выніку загінулі двое і паранены 22 вайскоўцы федэральных сіл. Падраздзяленні федэральных сіл сумесна з праваахоўнымі органамі Чачні правялі адрасную праверку па выяўленню баевікоў, якія засталіся ў Грозным пасля нападу на горад у пачатку сакавіка. Прадстаўнік федэральнага камандавання паведаміў, што ў выніку рэйду затрымана 11 асоб, якіх падазраюць у супрацоўніцтве з дудаеўцамі. Федэральныя сілы таксама правялі ачыстку раёнаў, якія прылягаюць да месцаў дыслакацыі расійскіх падраздзяленняў. Становішча ў чачэнскай сталіцы і яе ваколіцах застаецца адносна спакойным. 35 байцоў спецыяльнага атрада хуткага рэагавання УУС Прыморскага края адбылі ўчора з Уладзівастока ў Грозны для ўдзелу ў аперацыі па раззбраенню дудаеўскіх фарміраванняў. Як паведамілі ў прэс-службе УУС Прыморскага края, у саставе атрада ўваходзяць толькі вопытныя афіцэры, якія маюць добрую прафесіянальную вывучку. Гэта ўжо чацвёртая камандзіроўка прыморцаў на Паўночны Каўказ з пачатку баявых дзеянняў у Чачні.

ЭДУАРД ШЭВАРДНАДЗЕ З АФІЦЫЙНЫМ ВІЗІТАМ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў МАСКВЕ

Учора ў Маскве прайшлі перамовы між прэзідэнтам Расіі Барысам Ельцыным і прэзідэнтам Грузіі Эдуардам Шэварднадзе. Ён прыбыў у расійскую сталіцу з афіцыйным візітам. У цэнтры ўвагі сустрэчы кіраўнікоў дзвюх дзяржаў былі пытанні развіцця двухбаковых адносінаў і ўрэгуляванне сітуацыі ў Абхазіі і Паўднёвай Асеціі. Чакаецца, што ў ходзе візіту Шэварднадзе сустрэнецца з прэм'ер-міністрам Расіі Віктарам Чарнамырдзіным, мэрам Масквы Юрыем Лужковым і кіраўнікамі палат федэральнага сходу. У ходзе візіту прэзідэнта Грузіі чакаецца падпісанне шэрага двухбаковых дакументаў, у тым ліку дагавора аб гандлёва-эканамічным супрацоўніцтве ў 1996/97 гадах, аб марскіх перавозках, а таксама трансляцыі на Грузію радыё- і тэлепраграм з Расіі.

15 ХВІЛІН КОШТАМ У ДЗЕСЯТКІ ЖЫЦЦЯЎ

У нядзелю ў Маскве ўдалося ў апошнюю хвіліну папярэдзіць моцны выбух. Спецыялісты абязшкодзілі гадзіннікавую бомбу, знойдзеную шафёрам у салоне свайго аўтобуса. Бомба павінна была ўзарвацца праз 15 хвілін. Магутнасць зараду была настолькі вялікая, што выбухам быў бы знішчаны не толькі сам аўтобус, але і бліжэйшыя будынкі. Хто стаіць за гэтым, пакуль невядома.

БЕЗ ПРАВА НА ПАМЫЛКУ

Вядучыя краіны Захаду заклікалі Харватыю, Сербію і Боснію і Герцагавіну не падвяргаць рызыцы працэс мірнага ўрэгулявання на Балканах. Прадстаўнікі краін кантактнай групы па Боснії звярнуліся з гэтым заклікам да прэзідэнтаў трох балканскіх дзяржаў падчас Жэнеўскай канферэнцыі, што была склікана па ініцыятыве дзяржсакратара ЗША Крыстафера. Як падкрэсліваецца ў заяве кантактнай групы, у сувязі з беспарадкамі ў Сараеве былыя ўдзельнікі канфлікту ў Боснії больш не могуць дазволіць сабе не выконваць абавязкі, што вынікаюць з Дэйтанскіх мірных пагадненняў.

ШАНЦ ЁСЦЬ. ЦІ ЎДАСЦА ЯГО ВЫКАРЫСТАЦЬ?

Падчас выступлення на адкрыцці міжнароднай канферэнцыі ў Жэневе па раззбраенню дзяржсакратар ЗША Уорэн Крыстафер заклікаў 5 ядзерных дзяржаў не губляць дарэмна шанц заключыць дамову аб поўнай забароне на ўсе ядзерныя выпрабаванні. Пасля першых перамоў з кіраўнікамі КНР і Расіі Крыстафер заявіў, што можна весці размову пра збліжэнне пазіцый бакоў. Паводле яго меркаванняў, магчымасць заключэння дамовы ў гэтым годзе залежыць перш за ўсё ад Кітая, які настойвае на праве працягваць ядзерныя выпрабаванні ў грамадзянскім сектары.

БУТЭЛЬКА КОЛЫ ВЫШЫНЁЙ У 20 МЕТРАЎ

Амерыканская кампанія «Кока-Кола», адзін з асноўных спонсараў Алімпіяды ў Атланце, прыдбала 5 гектараў зямлі для будаўніцтва спецыяльнага алімпійскага парка. Рэалізацыя праекта будзе каштаваць некалькі дзесяткаў мільёнаў долараў. Парк будзе размешчаны недалёка ад Алімпійскага гарадка побач з цэнтральным офісам фірмы. У самым цэнтры парка будзе стаяць велізарная бутэлька кока-колы вышынёй у 20 метраў.

ФРАНЦУЗСКІЯ ПАЛІЦЭЙСКІЯ ГІНУЦЬ ПА ЎЛАСНЫМ ЖАДАННІ

Расце хваля самазабойстваў сярод французскіх паліцэйскіх. Апошнім часам сярод прадстаўнікоў гэтай прафесіі зарэгістравана 14 выпадкаў звядзення рахункаў з жыццём. Самая драматычная гісторыя адбылася ў адным невялічкім гарадку, дзе жанчына-паліцэйскі пакончыла з сабой, забіўшы перад гэтым траіх сваіх дзяцей. Большасць трагедый выкліканы прычынамі асабістага парадку, а таксама ўмовамі працы, якія прыгнятаюць псіхіку.

Радыё «Свабода», «Голас Амерыкі», «Радыё Расіі» і «Радыё-РОКС» слухаў Сяргей ПРОТАС.

ІНФАРМ-КАКТЭЙЛЬ

Незвычайную шлюбную цырымонію арганізаваў сабе ў цырку мэр калумбійскай сталіцы горада Багаты Антанас Манус. Ён і яго нявеста выехалі на слане на ператвораную ў клетку арэну, дзе знаходзіліся сем бенгальскіх тыграў. Пасля таго, як дрэсіроўшчыкі скончылі скачкі праз палаючы абруч і ўселіся на тумбы, мэр і нявеста злезлі са слана, падышлі да століка з рэгістрацыйнай кнігай і распісаліся. Мэр і яго нявеста завяршылі цырымонію доўгім пацалункам пад апладысменты аўдыторыі.

ІТАР-ТАСС

З цудам мяжуе выпадак, які адбыўся ў англійскім горадзе Дэрбі. Вэндзі Хег пылососіла кватэру, калі нечакана пачуўся крык дзіцяці. З жахам яна ўбачыла аголены провад у яго ў роце. Цела яе адзінаццацімесячнай Ларэн канвульсіравала, а з рота ішоў дымок. На шчасце, маці не страціла прытомнасць. Яна вырвала вілку з разеткі і з дзіцем пабегла ў бліжэйшую бальніцу. Урачы не паверылі вачам: Ларэн хутка ачуняла і, быццам нічога не здарылася, пачала гуляць. За выключэннем некалькіх апёкаў дзяўчынка зусім не пацярпела.

ЭКСТРА-ПРЭС

З кулявым раненнем дастаўлена ў бальніцу вучаніца восьмага класа адной са школ Арэнбурга. Дзяўчынка падышла да кіёска і раптам адчула рэзкі боль у плячы. Аднак выстралу ніхто з прахожых не чуў. Магчыма, хтосьці выпрабоўваў на жывой мішэні свой пісталет з глушыцелем. Урачы выцягнулі з яе цела кулю калібру 5,6 мм. Зламысніка шукаюць.

ЕАН.

КОЛЬКІ ЗАРАБЛЯЮЦЬ БРЫТАНЦЫ?

У Англіі лічыцца непрыстойным задаваць чалавеку пытанне пра памер ягонага заробку за тыдзень, месяц, год. Толькі вельмі блізкія адзін аднаму людзі могуць сабе гэта дазволіць, ды і то не заўсёды: залішняя цікаўнасць можа пашкодзіць нават даўняму знаёмству. У той жа час аклады дзяржаўных служачых ніхто не ўтойвае. Пытанне, хто колькі атрымлівае і хто чаго варты, — даволі частая тэма ў размовах.

Заробак працуючых у грамадскім сектары брытанцаў пераглядаецца кожны год. Усім ім гарантавана павелічэнне заробку на велічыню інфляцыі. Апошнім часам інфляцыя ў Злучаным Каралеўстве зусім малая і складае каля 2 працэнтаў у год. Асобным катэгорыям працоўных час ад часу павышаюць зарплату звыш інфляцыйных прыбавак. Уся гэта інфармацыя публікуецца ў прэсе, а таму кожны можа даведацца пра заробак іншых. Так, старшыя дзяржаўныя служачыя, супрацоўнікі ўрадавага апарату падзяляюцца на 10 класаў. На ніжэйшай прыступцы іерархічнай лесвіцы мінімальны заробак складае 38 тысяч фунтаў штогод, альбо 52 тысячы долараў, максімальны — 90 тысяч долараў. Гэта самае большае, на што вы можаце разлічваць, застаючыся на першай прыступцы. На найвышэйшай прыступцы знаходзяцца неадменныя міністэрскія сакратары. Іх, як і міністэрстваў, — 40. На гэтай пасадзе мінімум заробку складае 135 тысяч долараў, максімум — больш за 200 тысяч. Між іншым, гэтае вышэйшае чыноўніцтва атрымлівае значна больш за парламентарыяў — у тых зарплата складае недзе каля 50 тысяч долараў і таму яны патрабуюць, каб яе падвоілі. Заробак працоўных у кожнай сферы залежыць ад выслугі гадоў і ад якасці працы. Дакладней, ад таго, як тваю працу ацэньвае кіраўніцтва. З нядаўняга часу быў узяты курс на дыферэнцыяцыю заробку, улады намагаюцца такім чынам захвоціць людзей і атрымаць ад кожнага па ягоных здольнасцях.

Вернемся, аднак, да розніцы паміж аплатай працы. Чаму адным плацяць больш, а другім менш, і як гэтую розніцу ўспрымае публіка? Напрыклад, медыцынскім сёстрам, паводле агульнага меркавання, плацяць недастаткова — усяго 11 з паловай тысяч фунтаў штогод. У доларах гэта прыкладна 18 тысяч. Сапраўды, не так шмат. Але, урэшце, гэта толькі заробак пачынаючай медсястры. Такая ж, дарэчы, пачатковая зарплата і ў настаўнікаў. У канцы сваёй кар'еры настаўнікі, праўда, атрымліваюць ужо каля 50 тысяч долараў. Дырэктар школы пачынае кар'еру прыкладна з 40 тысяч, а напрыканцы мае 75 тысяч долараў штогод.

У арміі існуе вельмі складаная і расцягнутая іерархія заробку. На самым нізе — неспрактыкаваны радавы з 13 тысячамі долараў. На самым версе — брыгадны генерал. У яго заробак — 90 тысяч долараў. Прыстойная, але зусім не фантастычная сума. Наогул, у дзяржаўным сектары Брытаніі фантастычных заробкаў не бывае. Заробак тут, як бачым, вызначае дзяржава, кіруючыся пры гэтым меркаваннямі самымі рознымі, у прыватнасці, беручы пад увагу складанасць, інтэлектуальнасць працы, ступень асабістай адказнасці працоўнага. Улічваюцца таксама і бюджэтныя магчымасці.

Буйныя заробкі трэба шукаць па-за бюджэтнай сферай. Так, кіраўнікі вялікіх прадпрыемстваў атрымліваюць часам каля мільёна долараў. Столькі ж маюць буйныя банкіры. І сцвярджаюць, што заслужылі такія прыбыткі.

Але самыя значныя сумы можна цяпер атрымаць, працуючы ў галіне поп-музыкі, спорту, тэлебачання, выдання кніжнай прадукцыі для масавага чытача. Зорка першай велічыні на поп-сцэне мае 24 мільёны штогод. Футбаліст вышэйшага класа атрымлівае 2 мільёны, акцёры з папулярных «мыльных опер» — паўмільёна долараў, і публіка нічога не мае супраць. Відаць, памер ганарараў вызначаецца сілай і якасцю народнай любові да сваіх герояў.

Пятро РАГОЙША, (паводле матэрыялаў карпарацыі BBC).

НВП "Феліз" (генеральная ліцензія №13 от 12.07.1994г.) - афіцыйны дылер АО УАЗ рэалізуе са стоянкі у Мінску:

УАЗ-3303.....(бартавы)
УАЗ-31512.....(469)
УАЗ-31512-027..(паўлюкс)
УАЗ-31514.....(люкс)
УАЗ-3962.....(санітарны)
УАЗ-2206....(мікроаўтобус)

ГАЗ-3302 "Газель" (грузапасажырскі) ГАЗ-27181"Газель" (ізатэрмічная)

ГАЗ-31029 "Волга" (усіх мадыфікацый)

ВАЗ

ВАЗ-21043	6.600$
ВАЗ-21053	5.900$
ВАЗ-21061	6.100$
ВАЗ-21074	6.900$
ВАЗ-21091	6.200$

Сядзіба

Выпуск № 329 Рубрыку вядзе Мікалай ЧАХОЎСКІ

А СЦЕРАЖОНАГА І БОГ СЦЕРАЖЭ

Цяпер многія гараджане набываюць хімічныя ўгнаенні, розныя «лекі» ад каларадскага жука, паршы, фітафтарозу, іншых хвароб. Большасць у добрых упакоўках. Але дзе гарантыя таго, што дапытлівыя дзеці не захочуць паспрабаваць прэпараты? А салетру, якая рассыпана, могуць дзеўбануць і куры. Таму гаспадарам самы час паклапаціцца пра надзейныя схованкі. Памятайце, што нейтральных рэчываў няма. Усе шкодныя, вельмі небяспечныя для чалавека і жывых істот.

Таму правіла такое: знайшлі сродкі, каб набыць дарагія і неабходныя для вас прэпараты, — прыміце меры для іх надзейнага захоўвання.

На кожным — абавязкова павінна быць бірка ці кардонка, на якіх запісана назва хімічнага элемента і дата набыцця.

Другі важны фактар: уся «хімія» павінна знаходзіцца як мага далей ад месцаў, дзе знаходзяцца дзеці. Лепш, калі кожны элемент — салетра, хлорысты калій, суперфасфат, медны купарвас, карбафос, вапна, даламітавая мука, мел і, вядома ж, атруты будуць змешчаны ў асобныя пакеты, шчыльна завязаны ці «закансерваваны». Нават пад замком пакеты ляжаць не навалам, а асобна (салетра можа нават узарвацца ці загарэцца, калі для гэтага будуць адпаведныя ўмовы). Яшчэ лепш пакеты з кожным элементам пакласці асобна ў драўляныя скрынкі ці бочкі, добра іх накрыць. А можна кожны вялікі пакет уставіць у папяровы, а ўсё разам — у драўляную ёмістасць.

Засцерагаць ад вільгаці. Пад уздзеяннем вады адбываецца большасць непрыемнасцей. Таму на зямлю нічога не стаўце. Выключыце і жалеза з цэментам. Лепш накрыйце дошкамі і ўжо на іх стаўце свае хімічныя набыткі.

Само памяшканне, вядома, павінна быць сухім, цёмным. Сонечныя промні, размешчаныя побач ацяпляльныя прыборы таксама могуць спрыяць бядзе. Калі ў вас ёсць азотныя тукі (салетра, мачавіна), то іх абавязкова трымаць асобна ад калійных і суперфасфату. Справу можа сапсаваць і попел. Яго таксама ладкуйце ўбаку і абавязкова ў сухім месцы і сухой тары.

Асаблівая ўвага рэчывам, якія прымяняем у барацьбе з хваробамі і насякомымі ды вусенямі. Хай яны не датыкаюцца адзін да аднаго, ляжаць у сухіх месцах і падалей ад чалавека. Мяшочкі з цэлафану шчыльна завязаны (лепш заклеіць). На кожным — адпаведны надпіс. Вытрымліваць тэрміны іх захоўвання і выкарыстання. Калі гэтыя тэрміны прайшлі, утылізаваць. Не закопваць на дачы і асабліва на блізкай адлегласці ад калодзежаў, схованак сельгаспрадуктаў. Памятайце, што сцеражонага і Бог сцеражэ.

ШМАТ СОНЦА І Ў МЕРУ АЗОТУ — РАСЛІНЫ НЕ «ВЫЦЯГВАЮЦЬ ШЫІ»

«У нас — бяда: памідоры вельмі выцягваюцца, семядольныя лісцікі амаль у дзесяці сантыметрах ад зямлі».

СКУРАТАВЫ, Мінск

Падобныя трывогі ў многіх дачнікаў. Першая палова сакавіка выдалася не вельмі сонечнай. А корм раслінам даём адметны. Зрэшты, наш торфагрунт, які набылі ў магазінах, разлічаны на ўстойлівае і лепшае сонечнае асвятленне. Дадзім яшчэ, што палівы робім своечасова і дастаткова глыбока. Вось і гоніць азот уверх расліны. Вада, вядома, цёплая ці падагрэтая на батарэях ацяплення.

Нехта падумае, што мы прапануем «закруціць кранік»: зменшыць паступленне азоту і менш паліваць. Не, да гэтага не заклікаем. Нашы чытачы ведаюць, што падобная мера дасць іншы эфект раслінам. Проста зрабіце больш дзейсным асвятленне. Для гэтага: памыць вокны з двух бакоў (за зіму на шыбах утварыўся цэлы слой бруду і пылу), паставіць белую перашкоду-экран адразу за скрыначкамі з расадай. Яна будзе адбіваць святло на скрынкі з расадай. Падаконнік «пасвятлее». Меры простыя, а вынік будзе вельмі відавочным.

Яшчэ некалькі дзён зімы — і вясна стане паўнапраўнай гаспадыняй. Расаду можна вынесці на балкон, у зацішны куток сялянскага агарода ці дачы. Лепш пад плёнку. Толькі рабіць гэта паступова. Спачатку выносіць на 15—20 хвілін і паступова нарошчваць тэрмін на пяць—дзесяць хвілін. Выносіць іх чыстымі, без кропляў вады на лісцях. Інакш можа быць абпальванне, бо любая кропля вады — гэта як павелічальнае шкло.

Вядома, у двары лепш за ўсё зрабіць часовы парнічок, нават два слоі плёнкі. І ў пахмурнае надвор'е сонца нагрэе яго і залье святлом. У коўках раслін будзе свой міні-рай. Раслінкі будуць таўсцець у камлі, прыпыняць свой шпаркі рост уверх. Ні адна не «выцягне шыі», бо ўмовы ўсім самыя спрыяльныя.

Глеба ад залішняга ці недастатковага паліву робіцца шчыльнай. Гэта будзе стрымліваць доступ паветра да каранёў. Самі карані з цяжкасцю пераадольваюць такі бетон. Узрыхляльнік можа змайстраваць кожны. Для гэтага ў тонкую дошчачку ўбіць два цвікі-сракоўкі так, каб яны выступалі на некалькі сантыметраў. Адлегласць паміж імі — тры—пяць сантыметраў. Вось гэтай прыладай і рыхліце глебу пасля паліву і падкормак.

Яшчэ адна бяда — фіялетавы колер на лісцях і нават сцябліне. Гэта сігнал таго, што ў глебе, магчыма, і дастаткова фосфару, але ён па нейкіх прычынах не засвойваецца расадай. Выручыць выцяжка фосфару. У літровы слоік усыпце сталовую лыжку двайнога суперфасфату. Вада нагрэта да 40—50 градусаў і даходзіць да краёў. Драўлянай палачкай зрэдку памешвайце: за суткі-двое фосфар акажацца ў вадзе. Зліць з асадку і на агульную колькасць вады ў адзін літр браць 100 г (паўшклянкі) нашага раствору. Паліваць пад корань. Прыметны вынік будзе відаць праз сем—дзесяць дзён. Новыя лісцікі вырастуць без фіялетавай афарбоўкі. У гэты ж раствор добра дадаць і попел — дзве сталовыя лыжкі на той жа літр. Вашы гадаванцы атрымаюць яшчэ калій, кальцый, цэлы букет мікраэлементаў.

Магчыма, у некаторых расаднікі і без такіх ці іншых прымет. Перад пікіроўкай (за два дні) іх добра паліце гэткім растворам. Карані уцягнуць неабходнае сілкаванне ў запас і аддадуць пасля перасадкі. Расліна будзе прыжывацца без вялікіх пакут.

ПРАБЛЕМЫ З УРАДЖАЕМ СЛІЎ

Зноў шмат пісьмаў і званкоў пра слівы, якія цвітуць, здараецца, завязваюць плады, але на іх нападаюць нейкія вусені, робяць маленькія хады і... ураджай гіне.

Закладваючы свой сад, трэба цікавіцца ў прадаўцоў, самаплодныя сарты ці не. Калі не самаплодныя, то якія сарты набыць дадаткова, каб дрэвы цвілі, апылялася і давалі ўраджай. У любым выпадку неабходна на некалькі двароў ці дач мець хоць бы адну пчаліную сям'ю. Усяляк аберагаць восаў і чмялёў. Будзем памятаць, што добрыя гатункі («пердрыгон», «эдынбургская», «Еўразія», «узнагарода», «стахнаўка» ды і звычайныя «венгеркі») павінны штогод даваць да цэнтнера спелых плодаў з дрэва!

Неабходна садзіць некалькі сартоў. Тады верагоднасць апылення найбольшая. Ваш сад не будзе «прастойваць». У якасці апыльнікаў падыходзяць такія гатункі: «эдынбургская», «персікавая», «венгерка», «рэнклод Альтана», «Вікторыя». У Віцебскай вобласці ў свой час была распаўсюджана «жоўтая паўночная сліва». Выспявае на пачатку верасня. І плады добрыя, і апыльнік някепскі.

Цяпер пра ворагаў сліў. Іх даволі многа. Але нумар адзін — пілільшчык. Асобіна невялікая — нейкі сантыметр, тоненькая. Нечым нагадваюць тлустыя коскі, якія ставім у сваім пісьме. Гэтыя «коскі» габлююць верхнюю частку ліста, застаюцца толькі жылкі. Дрэву наносіцца шкода, здараецца, яно нават гіне. Але гэта не ўсё. Ёсць «сябар» слівы, які найбольш залезіць у малады плодзік. Пашукайце на дрэве плады з дзірачкамі. Разрэжце іх. Унутры сядзіць чарвячок. Вакол выедзена мякаць. Гэта слівавая пладажэрка. Зімоўка праходзіць у верхніх слаях глебы (да 8 см), расцічэпах дрэва, у іншых зручных месцах. З надыходам цяпла (звычайна перыяд масавага цвіцення) вылятае матылёк. Самка адкладвае яйкі на плодзік ці ля кветачкі. Лічынка хутка ўгрызаецца ў маладую мякаць. Поуе і костачку. Потым ля костачкі робіць пячоркутуалет. Адзін невялічкі вусень можа шкодзіць адразу некалькім пладам.

Меры барацьбы з гэтымі «коскамі» і пладажэркамі такія: абавязковае перакопванне прыствольных кругоў ці пераворванне. Адзін раз — рана вясной ці восенню. У гэты ж перыяд уносяцца ўгнаенні.

Для пладажэркі (яе лёт актывізуецца пасля 18 гадзін) робяць пасткі з кампоту, які псуецца. У слоік наліць гэты прадукт (на трэць), падвязаць з нахілам у 30—40 градусаў у кроне. Пладажэрка патоне, птушкі з'ядуць яе.

Апырскваць ядахімікатамі. Можна тымі, якімі апрацоўваем бульбу супраць каларадскага жука. Памятаць, што апошняя апрацоўка не пазней чым за месяц да збору пладоў.

«ДАПАМАЖЫЦЕ ЗНАЙСЦІ ЎПРАВУ НА... ДРАПЕЖНІКА»

Тры гады песцілі кусты чорнай парэчкі. Думалі, ну, нарэшце, пакаштуем сваіх ягад! Не ўдалося. Кранулі мінулай вясною куст, а ён упаў набок. Карані аказаліся з'едзенымі, многа вялікіх хадоў у зямлі. Нам сказалі, што на агародзе пасяліліся вадзяныя пацукі...

Вольга КРЫЛОВА, г. Барысаў.

Апошнім часам гэты драпежнік размнажаецца вельмі хутка, засяляе новыя і новыя прасторы. Сілкуецца каранямі парэчак (усіх яе відаў), агрэсту, маліны, абляпіхі, шыпшыны, нават яблыні, вішні, грушы, слівы. Звяркі такія пражэрлівыя, што за адзін асенне-зімовы сезон поўнасцю аб'ядаюць дарослае дрэва.

Гэтаму спрыяе незвычайная пладавітасць вадзяных пацукоў — да васьмі (!) вывадкаў за год. А ў кожным амаль дзесяць «дзяцей» (бывае і 15). Адна пара разам з патомствам можа мець за год да 800 асобін! Мы гаворым, што вельмі пладавітыя трусы. Але ім надзвычай далёка да пацукоў.

Пры гэтым іх мала хто знішчае. Каты амаль што не бяруць — у норы не залезуць. Лісы і сабакі толькі палохаюць, бо жвавыя жыхары падзямелля хутка перабягаюць у падрыхтаваныя на такі выпадак новыя прыстанішчы. Ну, а есці трэба ўсім. За адны суткі вадзяны пацук з'ядае столькі самай рознай ежы, якая па вазе роўная трэцяй частцы яго масы. Падлічым. Калі дарослы звярок важыць, скажам, 100—150 грамаў, то яму трэба харчу на суткі 30—50 грамаў. А сотні пацукоў? А тысячы?

Не здзіўляйцеся, калі ў вас на дачы падгрызены карані парэчак. Здараецца, набок кладзецца дарослая яблыня. Земляная саранча нішчыць пасадкі бульбы, морквы, буракоў, пятрушкі, рэдзькі і турнэпсу. Гэта іх улюбёныя прысмакі. Няма нічога іншага — тады бяруцца за карані.

Нагадаем: пацук мае ў даўжыню 15—20 сантыметраў з амаль такім жа доўгім хвастом. Афарбоўка ад бура-шэрай да цёмна-бурай, нават чорнай. Летам жыве ў норах ля берагоў вадаёмаў ці ў нізкіх мясцінах. Ласуецца расліннымі, якія там у вялікай колькасці. У пачатку восені перабіраецца на агароды. Робіць зімовыя прыпасы з бульбы і караняплодаў. Тут і праводзіць зіму, зрабіўшы надзейныя хады пад дрэвы. Калі знайшлі кладоўку, скажам, бульбы, не выкарыстоўвайце: тыя прыпасы заразныя. Іх як найглыбей закапаць.

Меры барацьбы такія. Не знішчаць ласку — белаватага, вёрткага звярка. Калі і не возьме пацука, дык выкурыць абавязкова.

А далей — нуль. Ні паляўнічыя сабакі, ні лісы дастаць пацука амаль што не ў стане. Хіба што нейкага разяваку ці хворага.

Застаюцца прынады. А гэта як ні круці, а дрэнная з'ява ў экалагічным стане. І ўсё ж мусім карыстацца менавіта імі.

Пацукі любяць пячэнне, сушкі, зерне злакавых, сланечнік, гарох, кавалачкі сала і мяса, варанае яйка, тваражок. Вось ва ўсё гэта «ўціснуць» атруту — фасфід цынку. Ці нешта іншае. У крамах прадаецца спецыяльны прэпарат для пацукоў. Можна нешта заказаць на санстанцыі. Падыдзе вялікая доза снатворнага.

Нарэшце, можна выкарыстаць «вар'яцкі» метад. Пячэнне ці зерне сланечніку змалоць на пыл. На дзве трэці «мукі» дадаць адну трэць цэменту ці алебастру (гэта лепш). Побач з такой прынадай паставіць ваду — паеўшы, пацукі хочуць піць. У страўніку алебастр (цэмент) цвярдзеюць, разбойнік гіне.

Ставячы прынады з атруты, паклапаціцеся аб тым, каб яны не трапілі птушкам і хатняй жывёле, дзецям. Лепш зрабіць нават спецыяльныя схованкі са скрынак, дошчачак, труб ці жалезных лістоў. Ніхто, акрамя пацукоў ды мышэй, не павінен дабрацца да гэтых месцаў.

БУЛЬБА-ГАЛАНДКА

Цяпер шмат гаворкі пра галандскія сарты бульбы. Напішыце, якія гэта сарты, калі выспяваюць, які ўраджай?

Іван МЯСНІЦКІ, г. Баранавічы.

У нас культывуюцца: ранняя сарты — «прыор», «аноста», «астара», «канкордэ»; сярэднеспелыя: «аўсонія», «марфона», «кандэр», «рэсі»; сярэднепазнія: «агрыя», «сантэ», «рамана», «сатурна». Ёсць і найноўшыя.

Амаль усе сарты ўстойлівыя супраць нематоды — галоўнага ворага бульбы. Да фітафторы, на жаль, малаўстойлівыя. Вірусным хваробам паражаюцца ў слабай ступені. Тое ж тычыцца і паршы.

Ураджайнасць усіх сартоў даволі высокая. «Сантэ» многія беларускія агароднікі ўжо ацанілі. Хоць, заўважым, смакавыя якасці не вельмі адметныя. «Аноста» выспявае адначасова з вядомай «ружоўкай». Але яе смакавыя якасці і крухмалістасць, безумоўна, лепшыя. «Аноста» можа прынесці з соткі 300—400 кг буйных пладоў. «Рамана» выспявае даволі позна. Але ўраджай дасягае 600 кг з той жа соткі. Вельмі буйныя бульбіны. Вочкі зусім неглыбокія. На апошняе селекцыянеры звяртаюць асаблівую ўвагу. Усе галандскія сарты з неглыбокімі вочкамі. І гэтых вочкаў нямнога. Сцябло ў расліны адно, зрэдку тры-чатыры. Але вельмі магутныя. Так яны лепш забяспечваюцца сонечнай энергіяй.

ІНТЫМНАЕ

«ОЙ ТЫ ЛЮБОЎ, ЛАМОТА...»

Каханне і бальніца — рэчы, здавалася б, такія ж далёкія, як зямля і неба. Тым не менш, павандраваўшы паўгода з гакам па розных лячэбных установах, магу засведчыць: высокае пачуццё ўладарыць і тут. У каго абвастраецца ці з'яўляецца ўпершыню, а ў каго — і такое бывае — знікае наогул.

Раскажу дзве гісторыі.

ЛЁХАВА ГОРА

З ім, Лёхам, пазнаёміўся я ў Магілёўскім тубдыспансеры. Ляжаў ён даўно і, як хвораму з працяглым тэрмінам лячэння, належаў яму адпачынак дома, вядома, з дазволу ўрача.

Лёха і паехаў.

Прыехаў. Жонка пачала збіраць на стол.

— Вось табе лыжка, вось табе відэлец, — сказала кабета. — Запомні, гэта толькі твае. Асобныя. Каб іншыя не браў. Чым-небудзь памеркі зрабі.

Лёха быў тугадумам, і да яго не адразу дайшло.

Але калі дайшло, Лёха раз'юшыўся і пабіў сваю бабу на «табаку».

Пасля таго развяліся.

Накіравалі Лёху ў туберкулёзны дыспансер не таму, што ён быў нейкі заразны. На рэнтгене знайшлі ў лёгкіх цьмяную кропачку. Урачы хацелі як лепш, падумалі пра тое, пра што падумалі, і пачалі лячыць. Сядзіць кропка! Пракруцілі пацыента на камп'ютэры, г. зн. на галандскай дыягнастычнай апаратуры, што, дарэчы, абыходзіцца вельмі дорага. І здрыгнуліся: у Лёхі, аказваецца, было паламана рабро. Яшчэ ў дзяцінстве. Аб чым Лёха не ведаў або забыў, але дактарам пра траўму не расказваў. Рабро зраслося, але трэшчынка засталася.

Гэта выявілася тыдні праз два пасля таго, як Лёха так і не паеў дома сваёй «асобнай» лыжкай.

Вярнуўшыся пасля пабыўкі ў бальніцу, ён упаў у дэпрэсію.

Дэтэктываў у нашым аддзяленні было хоць заваліся, толькі чытай, аднак Лёха адкапаў недзе зборнік вершаў малазнаёмага паэта і ўтыркнуў туды нос.

Калі мы развіталіся — я ў бальнічным «бушлаце», а Лёха ў сваёй грамадзянскай куртцы — ён нечакана прадэкламаваў:

Проверяет людей больница,
Кто друзья, а кто просто лица.
Проверяет она не больных,
Под рентгеном — знакомые их.
Лишь на белую койку попав,
осознал я, что был не прав,
Когда жизнь отдавал другим,
А теперь стал не нужен им.

Чытаючы гэты верш, Лёха, напэўна, меў на ўвазе, што бальніца правярае не толькі сяброў, але і каханне, трываласць шлюбу, які ў яго даў трэшчыну з-за нейкай нязначнай трэшчынкі ў рабры.

МІШКАВА ШЧАСЦЕ

Флюіды кахання, кажуць, уласцівы санаторыям. Там, маўляў, імі літаральна насычана паветра. Санаторнага вопыту ў мяне мала, тым не менш, нешта падобнае бачыў.

Новаму чалавеку, які не прывык да вандровак па месцах адпачынку, цяжка псіхалагічна. Мне, напрыклад,— і на Нарачы, і ў Астрашыцкім Гарадку — сумна і смешна было назіраць, як хутка пераўвасабляюцца людзі. Раніцай яны стогнуць ля кабінетаў урачоў або ў чаканні працэдур, скардзячыся адзін аднаму на свае шматлікія хваробы. Але паглядзелі б вы на гэтых «хворых» вечарам. На танцах бабулька, якая даўно на пенсіі, начапіла спадніцу з разрэзам да аднаго пікантнага месца і скача, як фігурыстка на лёдзе. Яе ўхажор з сівой барадой і тоўстым пузам адкідвае нумары, якім можа пазайздросціць жаўтаротая публіка. Грукат, хоць затыкай вушы. Пахне потам, перагарам, духамі і яшчэ чорт ведае чым.

Зрэшты, людзі таму і людзі, што ў іх ёсць розум, і словы яны прыдумалі для таго, каб не гаварыць праўду. Таму танцы ў нас называюцца культурным мерапрыемствам, хаця, як і ў жывёльным свеце, гэта не што іншае, як любоўныя гульні.

Аднойчы, каюся, я пазабаўляўся, пазычыўшы ў знаёмага доктара белы халат і шапачку і зрабіўшы вячэрні абход, чаго самі ўрачы чамусьці не практыкуюць, відаць, саромеюцца. І правільна робяць.

— Доктар, каньячку, калі ласка, выпіце, каўбаскі з'ешце, свая, вясковая, толькі не паведамляйце сям'і.

Быццам мне рабіць болей няма чаго, акрамя як «стукаць» рагатаму мужу.

Але санаторнае каханне — гэта кветачкі ў параўнанні з бальнічным. Тут людзі на краі бездані, можа, у іх гэта апошняе.

Калі Лёху пакрыўдзіла жонка (калі б кахала, дык так не зрабіла б) толькі таму, што ён трапіў ва ўстанову з назвай, якая пужае, то ў Мішкі, хоць ён сапраўды лячыўся ад туберкулёзу, адбыўся зусім іншы паварот лёсу.

У Мішкі не было нікога. Хто не быў адзінокім, той ніколі не зразумее, што гэта такое. Хворыя звычайна жывуць чаканнем наведвальнікаў. Мішку не было каго чакаць. І на пабыўку яму не было куды ездзіць.

— Куды? Да сябе самога? — адмахваўся ён ад цікаўных.

У Мішкі была кватэрка ў абласным цэнтры. Посуд ён вымыў, а болей рабіць там не было чаго.

Таму Мішка, калі наступалі выхадныя і ўрачоў не было, а сябры раз'язджаліся па дамах, выходзіў за вароты бальніцы і бязмэтна бадзяўся па ваколіцах, пагружаны ў свае змрочныя думкі. Неяк яго спынілі:

— Мужчына, вы не падкажаце, як нам адсюль лепш паехаць? З якога прыпынку?

Мішка спытаў, куды трэба ехаць, і, паколькі рабіць яму ўсё роўна не было чаго, падахвоціўся праводзіць.

Па дарозе разгаварыліся. Жанчына з пяцігадовай дачкой (дома няма на каго пакінуць) прыязджала на ўскраіну горада купіць алею. Аднак алей паспелі разабраць і вось даводзіцца вяртацца ні з чым.

Аўтобуса доўга не было, маці дастала з сумкі булачку, працягнула дачцэ. Тая пачала ўсухамятку жаваць.

Мішка крутнуўся да «камка», купіў шакаладку і «пепсі».

— Не бяры,— папярэдзіла маці.

— Чаму, мам? У гэтага дзядзі вочы добрыя.

Мішка збянтэжыўся. Прашаптаў: «Баіцеся, што заразны?»

Калі прыйшоў аўтобус, ён спытаў:

— Вы яшчэ прыедзеце?

Адказу ён не пачуў, але наўздагон — дзверцы яшчэ не зачыніліся — крыкнуў:

— Я ўсё роўна буду чакаць. Праз тыдзень на гэтым месцы.

Мішка ляпнуў так, не падумаўшы, але праз тыдзень на прыпынак усё ж прыйшоў. Хутчэй па той жа — ад няма чаго рабіць — прычыне.

З таго часу Мішкава жыццё перавярнулася. Ён павесялеў. А наяўнасць станоўчых эмоцый — вам скажа любы доктар — для выздараўлення найпершы фактар.

Тамара — так звалі тую адзінокую жанчыну-маці — прыходзіла да Мішкі часта. Прыносіла мёд, апельсіны. Хаця сама, падазраваў ён, перабіваецца з хлеба на квас.

Мішка збрыў бараду і пачаў кожны дзень галіцца. Ён перастаў зазіраць у чарку, чым звычайна грашылі хворыя, і, калі атрымаў грошы па чарговым лістку непрацаздольнасці, сабе пакінуў толькі на курыва, астатнія аддаў Тамарцы.

— Хто гэта да цябе прыходзіў? — цікавіўся які-небудзь недасведчаны навічок.

— Жонка, хто ж яшчэ,— абыякава адказваў Мішка.

А ў вачах, якія ён спрабаваў схаваць, зяяла шчасце.

Імёны зменены, а прозвішчы не называю: навошта? Жыццё ж усё-такі асабістае, а каханне — справа інтымная.

Васіль ЛЕЎЧАНКА.

СЫТЫ САЛДАТ — ДОБРЫ САЛДАТ



Яшчэ да новай эры людзі ведалі: воіна трэба добра накарміць, апрануць, праявіць аб ім усебаковы клопат. Тады і воін будзе моцным і мужным — як і належыць воіну. Так было заўсёды, так і далей будзе. Нездарма кажуць: калі краіна не клапоціцца аб сваёй армі, то яна будзе карміць чужую. Хай Бог бароніць нас ад такой бяды.

Трэба аддаць належнае Міністэрству абароны нашай рэспублікі. Пытанням харчавання Узброеных Сіл тут удзяляецца шмат увагі. Сістэматычна ў вайсковых часцях праводзяцца кантрольна-паказальныя мерапрыемствы па якаснаму прыгатаванню ежы.

Фотаздымкі, якія мы прапануем сваім чытачам, былі зроблены нядаўна ў разведбатальёне 120-й дывізіі, якім камандуе падпалкоўнік Васіль Барысёнак. Калектыў сталовай гэтага батальёна адзначаны начальнікам харчовай службы тылу Узброеных Сіл палкоўнікам Уладзімірам Мялюшкам як адзін з лепшых у дывізіі.

НА ЗДЫМКАХ:

1. На кухні працуе былы выпускнік мінскага кулінарнага вучылішча № 221 радавы Віктар Белаглазаў.

2. Старшы афіцэр прэс-службы Міністэрства абароны Міхаіл Пінчук гутарыць з начальнікам сталовай прапаршчыкам Тамарай Талюк і ўрачом батальёна прапаршчыкам Леанідам Стэцко;

3. У час абеду.

Фота Мікалая АМЕЛЬЧАНКІ.

ДЭБЮТ

ЗАПОМНІЦЕ ГЭТА ІМЯ

Калі ласка, знаёмцеся: Наталля Чарнабай, маці дваіх дзяцей, жыве ў вёсцы Чамярысы Брагінскага раёна, піша апавяданні.

Наталля даслала два вучнёўскіх сшыткі і прасіла даць водгук. Спачатку я крыху разгубіўся: мая прафесія — не літаратурны крытык, ніколі рэцэнзій не пісаў, мо толькі на факультэце журналістыкі. Праўда, гэта было даўно.

Потым падумаў: а ў чым справа, уласна кажучы? Я проста чытач і павінен сказаць — цікава гэта ці не. Усё стала на свае месцы: гэта цікава. І гэта абнадзейліва. Два апавяданні Наталлі Чарнабай — гэта апавяданні дзіцячай пісьменніцы. Інакш кажучы, крыху не ўпісваюцца ў стыль нашай сур'ёзнай газеты. Трэцяе — нават не апавяданне, хутчэй эсэ.

Брагінскі раён увогуле, а вёску Чамярысы — у прыватнасці, я памятаю вельмі добра. Два гады ў пачатку кар'еры мы там жылі і працавалі. Цудоўнае, пранізліва-беларускае, рамантычнае месца. На жаль, усё гэта ў мінулым, і чаму — усе выдатна ведаюць. Зараз там жыцця няма. Зараз там толькі рэшткі жыцця. Чарнабай выбрала для свайго эсэ, на першы погляд, не вельмі ўдалую назву. Але пачытайце, вельмі дарэчы назва.

Увогуле, рэкамендую запомніць гэта прозвішча. Я не люблю раздаваць авансы, але тут іншы выпадак: мы маем справу з літаратарам, які склаўся, са сваім стылем і мовай. Ні прыбавіць, ні адняць.

Як гаворыцца, у добры шлях, Наталля.

Сяргей ШАЎЦОЎ.

MEMENTO MORI

Вясна адкінула снежную коўдру ад зямлі. Тая прыўзнялася маладою траўкай на пагорках, працягнулася да неба прыветнымі птушынымі ўскрыкамі, уздыхнула першай сваёй баразною. Дзе шэрая, дзе глеістая, а дзе наскрозь чырвоная ці чорная, яна дае пачатак усяму жывому ў Сусвеце. Але папярэджвае свайго хлебароба, які кідае ў глебу першае зерне: «Я атручаная. Горыч прайшла мяне наскрозь 10 год назад, і я не магу пакуль сама ачысціцца. Дапамажы мне, чалавеча! Але ж і помні аб смерці. Калі ж ты скончыш свой век, я прыму цябе ў свае нетры і прарасцеш ты на роднай зямельцы квітнеючымі садамі, валошкамі і незабудкамі. Memento mori». Свежы ветрык прынёс подых першай навальніцы. Ён ахутаў палі і гаі, лясы і гаі, чаромхавай галінкаю стукнуў у шыбу. Гэты веснавы вецер прыцёг немаведама адкуль цёмную тоўстую хмару з Пярунам у калясніцы і гойсае, прыхіляючы яблыні і слівы амаль да зямлі. Як суцішыць цябе, вятрыла, хіба што пачакаць, пакуль міне навальнічная навала? А той у адказ: «Шмат гадоў таму табе прынёс я другую, чарнобыльскую. Я атручаны і дзьму так, як завіхурыць мяне прырода. Калі табе, сябра, стане горка і дрэнна, адчыні сваё вакенца, упусці мяне да сябе. Табе стане крыху лепей, але ж помні аб смерці. Я падымаю ўгору пыльную шуру-буру і пераношу яе з месца на месца, а дзе ўчора не было стронцыю ці цэзію, назаўтра ён затрымціць у паветры. Memento mori». Шырока і павольна коціць свае воды да Чорнага мора сівы Дняпро. Красавіцкім ранкам рыбак адвязаў лодку і паплыў на сярэдзіну ракі. Закінуў ён свае вуды, раптам чуе, як стогне, гайдаючы блакітна-шэрымі хвалямі лодку, Дняпро-бацюхна:«Я атручаны. Бачыў бог, што баранюся я ад Чарнобыля сваімі высокімі берагамі, кідаў уздоўж і ўпоперак іх сумнымі ветразямі-хвалямі. Але нябачна ссыпаўся попел са станцыі да самых маіх глыбінь, куды не пракіне ніводнага промніка ласкавае веснавое сонейка. Радыяцыяй прапіталіся мае камяні і водарасці. Memento mori». Вясёлы жаўрук услаўляе красоты зямлі ў чыстым веснавым небе, пяе свае птушыныя гімны ўзыходзячаму сонейку. Плыве на небе белае воблачка, лёгкай фіранкай зачапіла слаўнага пеюна. «Я атручана, — кажа воблачка; колькі разоў рабіла я кругаварот па-над лугамі і азёрамі, праліваючыся горкімі слязінкамі... Сцеражыся мяне, жаўручок. Помні аб смерці». Нарадзілася на Зямлі маленькае дзіцятка, ссала малачко з цёплых маатуліных грудзей, пакуль не прыспеў час спусціцца з клапатлівых і мяккіх рук на свае кволыя ножкі. Маці пусціла яго долу на чарнобыльскую зямельку басаногім яркім веснавым днём, калі пяшчотны паўднёвы ветрык абвяваў усмешкаю яе вусны. Дзіця адарвалася ад матулінай спадніцы і пайшло ў Свет...

Дык што ж рабіць нам, браткі-беларусы? То можа будзем жыць і спадзявацца, што горкі палын не азмрочыць нашае далейшае жыццё, а нябесныя далі будуць заўсёды светлымі і празрыстымі? Дык давайце жыць і верыць, што зямля стане чысцюткаю, вятры — добрымі, лясы — гаючымі, аблокі — белымі, дажджы — цёплымі, а дзеткі, што нараджаюцца, — шчаслівымі і здаровымі, абавязкова; і кожны з іх будзе спадзявацца на сваю палымяную запаветную зорачку.

А калі ж прыйдзе наш час і анёлы панясуць нас на неба, мы пакінем ім у спадчыну любоў да роднай параненай зямлі...

Наталля ЧАРНАБАЙ.

ТЭЛЕБАЧАННЕ, 20 сакавіка

Беларускае тэлебачанне

14.30 «Следства вядуць Калабкі». Мультфільм.
15.00 Навіны.
15.15 «Юрка — сын камандзіра». Маст. фільм («Беларусьфільм»).
16.25 «Спорт, каханне і фантазія». Кінаканцэрт.
17.05 Крэда.
17.20 Госці ў хату.
17.50 Музычны антракт.
18.00 Тэлеконкс.
18.05 «Чым багаты...» Беларускае оптыка-механічнае вытворчае аб'яднанне.
18.25 Эканамікст.
18.35 «Тройчы па аднаму». Музычная перадача МТУ.
18.50 Навіны (з сурдаперакладам).
19.00 «Вяртанне ў Эдэм». Тэлесерыял.
19.55 «Хто гэта?» Тэлегульня.
20.00 Чарнобыль: праблемы і вырашэнні. Дубровенская вячэра.
20.40 Калыханка.
21.00 Панарама.
21.55 Музычны антракт.
22.05 Тыдзень тэлебачання Малдовы. «Лучафэрул». Маст. фільм. 1-я серыя.
23.35 Каралеўскае паляванне. У перапынку **(24.00)** — Навіны.
0.30 «12, ці На ноч гледзячы». Забаўляльная праграма.

ГРТ

14.00 Навіны (з сурдаперакладам).
14.20 «Прыгоды ў Адысеі». Мультсерыял.
14.40 Кактус і К.
14.50 До-мі-соль.
15.10 Кліч джунгляў.
15.35 «Элен і хлопцы».
16.00 «Тэт-а-тэт».
16.30 «Сем дзён спорту».
17.00 Навіны.
17.20 «Сакрэт трапіканкі».
18.20 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. «Спартак» (Масква) — «Нант» (Францыя). Трансляцыя. У перапынку — «Спакойнай ночы, малышы» 11 мін., рэклама УЕФА 1.20, рэклама ГРТ 2 мін. Магчымы дадатковы час да 22.10.
20.20 Час.
21.00 Праграма перадач.
21.05 Камедыя Юрыя Маміна «Фантан».
22.50 Навіны.
23.00 Кінематограф.
23.30 Футбол. Ліга чэмпіёнаў. 1/4 фіналу. Агляд 3-х матчаў да 1.45.

Тэрмінова прадаю новую двухпавярховую дачу
ў в. Сутокі Смалявіцкага раёна — за 45 км ад Мінска, месца цудоўнае, нядорага.
Тэл. (0172) 24-86-77.

Згубленае пасведчанне ўдзельніка вайны ў Афганістане № 000550 серыі А, выдадзенае на імя Седзюкевіч Таццяны Вітальеўны, лічыць несапраўдным.

Згубленае пасведчанне ўдзельніка ВАВ № 896124 серыі А, выдадзенае на імя Крэмер Сары Юдзелеўны, лічыць несапраўдным.

ПРАДАЕМ
ТРУБЫ
дыяметрам:
57, 108, 114, 133, 159, 219, 530, 1420.
ЛІСТ
3; 4; 4,5 мм.
ШВЕЛЕР 14.
Тэл/факс (0172) 34-22-52.

ОРГАНИЗАЦИЯ ПРОИЗВОДИТ, УСТАНАВЛИВАЕТ ПОД КЛЮЧ И РЕАЛИЗУЕТ БЕЗ УСТАНОВКИ АРОЧНЫЕ СООРУЖЕНИЯ
12х30х6,5 и 15х30х7,5 холодного и утепленного вариантов с любым покрытием крыши (алюминий, цинк, шифер и т. д.) по самым низким ценам в Беларуси в кратчайшие сроки от 1 до 2,5 месяцев.
РЕАЛИЗУЕМ:
- Лист х/к — толщ. от 0,6 до 1,5 мм (отсортировка от экспорта);
- Лист г/к, рядовой — толщ. 2,8; 3,0; 3,5; 3,9; 4,0 мм;
- Труба эл/св., ГОСТ 10705, диам. 76; 89; 108; 114 (стенка 4 мм); 152; 159 (стенка 4,5 мм);
- Трубка г/к, ГОСТ 8732, диам. от 83 до 152, толщ. стенок от 3 до 20 мм (под заказ, оплата — по факту поступления);
- Трубы прямошовные эл/св. общего назначения, газонефтепроводные, диам. от 219 до 1420 (под заказ, оплата — по факту поступления).

Телефоны в г. Солигорске: (01710) 2-42-10; 2-15-15.

РЕАЛИЗУЕМ
ВЫКЛЮЧАТЕЛИ врубные ВР32 (100, 250, 400, 630, 1000А)
ПРЕДОХРАНИТЕЛ